У самым цэнтры Ружан, на вуліцы Леніна, стаіць двухпавярховы будынак — прадстаўнік тыповай гарадской забудовы другой паловы XIX стагоддзя. І невядома, які лёс напаткаў бы гэты будынак, калі б не ўраджэнка пасёлка, а цяпер мінчанка Святлана Бялько. МС



5 сакавіка ў ВНУ распачалася рэгістрацыя абітурыентаў для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі. Шчыра кажучы, многія па сённяшні дзень не разумеюць сэнсу гэтай даволі працаёмкай і нятаннай працэдуры... СТАР 3

Сёння многія прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва маюць смеласць сказаць, што яны моцныя і могуць паклапаціцца самі пра сябе. «Я сама» — гэта не лепшы лозунг, паводле меркавання Таццяны. Яна не ўяўляе сабе жыццё без мужчын і кахання. СТАР 4

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

7 САКАВІКА 2012 г. СЕРАДА № 45 (27160) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІЦЫ!

Сардэчна віншую вас з Днём жанчын.

Гэтае першае веснавое свята прыўносіць у жыццё абуджэнне светлых пачуццяў павагі, удзячнасці і любові да цудоўнай паловы чалавецтва.

Самай высокай ацэнкі заслугоўвае ваша актыўная пазіцыя ва ўмацаванні маладой беларускай дзяржавы, у развіцці аховы здароўя і адукацыі, культуры і навукі, спорту, бізнэсу і фінансавай сферы. Тут вы праяўляеце свае лепшыя рысы — дабрыню, чуласць, мэтанакіраванасць і адказнасць.

Спакон веку жанчына шануецца як захавальніца хатняга ачага. Многія з вас сумяшчаюць прафесійную дзейнасць і выхаванне дзяцей. Нізкі паклон вам за гэта.

Няхай сёння па-асабліваму гучаць словы ўдзячнасці маці, жонкам, дочкам, усім жанчынам, якія сваёй прыгажосцю, цеплынёй і спагадлівасцю напаўняюць і ўпрыгожваюць наша жыццё.

Здароўя і дабрабыту вам і вашым блізкім. Поспехаў ва ўсіх добрых пачынаннях.

Будзьце шчаслівыя!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНУЕ ПРАВЕСЦІ РЭВІЗІЮ СУМЕСНЫХ З ІРАНАМ ПРАГРАМ ДЛЯ АКТЫВІЗАЦЫІ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Беларусь супраць усялякага дыктату і навязвання волі звонку. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 6 сакавіка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Ірана Алі Акбарам Салехі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Мы вельмі ўважліва сочым за сітуацыяй, за тым, як яна разгортваецца вакол вашай краіны. І мы да яе не абыякавыя, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы спачуваем усяму таму, што адбываецца вакол Ірана, таму што і самі часам адчуваем няхай не такія жорсткія нападкі на нашу краіну, але тым не менш».

«Мы актыўныя праціўнікі ўсялякага дыктату і навязвання волі звонку. Мы супраць таго, каб суверэннай, незалежнай дзяржаве збоку ўказвалі, як ёй развівацца і ў якім напрамку», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён выказаў упэўненасць, што так разумеюць гэта і ў Іране.

«Любое кіраўніцтва любой краіны павінна быць нацэлена на тое, каб было лепш і стабільней жыць грамадзянам гэтай краіны. І я ведаю, што ваш Прэзідэнт, і парламент, і духоўны лідар нацэлены менавіта на гэта, і мы такую палітыку падтрымліваем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да госця.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што ў яго склаліся вельмі добрыя і цёплыя адносіны з кіраўніком Ірана і яго духоўным лідарам. «Вельмі спадзяюся, што пасля парламенцкіх выбараў, якія, на шчасце, прайшлі ў вас нармальна, Іран стане яшчэ больш стабільным, мабільным і будзе накіраваны ў будучыню ў імя сваіх грамадзян», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Гаворачы пра беларуска-іранскія адносіны, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дарожная карта або праграма двухбаковых дзеянняў вызначана. «У Беларусі ні на крок не маюць намеру адступаць ад гэтай праграмы. І, калі на гэта ёсць воля вашага кіраўніцтва, мы будзем яшчэ больш актыўна ажыццяўляць тыя планы, якія мы намецілі на многіх сустрэчах з кіраўнікамі Ірана», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што расцэньвае цяперашні візіт міністра замежных спраў Ірана перш за ўсё як магчымасць ацаніць двухбаковыя адносіны на гэтым складаным этапе і ажыццявіць пэўную рэвізію праграм, якія рэалізуюцца. «Спадзяюся, што вы з вашым беларускім калегам ажыццявіце такую работу, і я буду ўдзячны, калі яна прывядзе да больш шырокага супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Алі Акбар Салехі падкрэсліў, што для яго вялікі гонар сустрэцца з Аляксандрам Лукашэнкам. «Вас добра ведаюць у Іране, і я заўсёды хацеў атрымаць магчымасць сустрэцца з такім выдатным чалавекам», — сказаў міністр. «Успрыманне вас нашым народам вельмі пазітыўнае, паколькі вы заўсёды імкнуліся да незалежнасці. І мы ведаем, што імкненне да незалежнасці мае цану і за гэта трэба плаціць. І вы, і ваш народ праяўлялі сапраўдную мужнасць на працягу апошніх 20 гадоў. Менавіта гэта дало магчымасць Беларусі дабіцца высокага статусу на міжнароднай палітычнай арэне», — лічыць міністр замежных спраў Ірана.

«Так, вы сутыкаліся з праблемамі, зведвалі націск, але ўрэшце вы выйдзеце з сітуацыі пераможцамі, паколькі справядлівасць возьме верх», — дадаў госць.

Алі Акбар Салехі перадаў Аляксандру Лукашэнку найлепшыя пажаданні ад Прэзідэнта Ірана Махмуда Ахмадзінежада. Міністр падкрэсліў, што цяпер іранскі бок разглядае магчымасць знаходжання новых падыходаў двухбаковага супрацоўніцтва. Ад імя Прэзідэнта Ірана ён таксама перадаў Прэзідэнту Беларусі запрашэнне наведаць з візітам Іран.

ВЯСНА НА СТАЛІЧНАЙ ВУЛІЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



г. Мінск.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр КОСІНЕЦ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:

«Шмат цудоўных слоў апяваюць жанчыну, але самае галоўнае з іх — «мама». Няма ў свеце нічога больш святога, чым жанчына, якая падарыла жыццё. Самая складаная прафесія на Зямлі — нарадзіць і выхаваць дзіця».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.03.2012 г.

Долар ЗША	8180,00	▼
Еўра	10800,00	▼
Рас. руб.	278,00	▼
Укр. грыўня	1017,79	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 6°
Віцебск	– 10°
Гомель	– 8°
Гродна	– 8°
Магілёў	– 10°
Мінск	– 10°

СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ БУДЗЕ ПАСТУПОВА ЗНІЖАЦЦА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 6 сакавіка прыняў з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзею Ермакову. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Як адзначыў Прэзідэнт, у цэлым сітуацыя на фінансавым рынку Беларусі складваецца спакойная. «Адбыліся зрухі па стаўцы рэфінансавання (цяпер стаўка рэфінансавання складае 38 працэнтаў гадавых. — **Заўвага БЕЛТА**). Гэта добра, тэндэнцыя нармальная, і мы пераконваемся ў тым, як мне дакладвае ўрад, што гэта крокі ў правільным напрамку. У гэтым напрамку мы і будзем дзейнічаць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Стаўку рэфінансавання трэба зніжаць для таго, каб эканоміка магла атрымаць больш танныя грошы. Яны патрэбны. Нас жыццё ўжо да гэтага падвяло. Самі банкіры, якія непасрэдна працуюць з рэальным сектарам, гавораць, што нам сапраўды трэба ісці на зніжэнне стаўкі рэфінансавання, каб крэдыты былі больш даступнымі».

На сустрэчы таксама была абмеркавана тэма інфляцыі. «Урад мне дакладвае аб тым, што на некаторыя тавары цэны пайшлі ўніз. Інфляцыя ў нас звязана з рэгуляваннем цэн, з тым, што мы самі рэгулюем, дапусцім, у адукацыі, іншых сферах. Гэта — адміністрацыйнае рэгуляванне, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — І гэта таксама добра, таму што рыначная інфляцыя там, дзе цэны залежаць чыста ад попыту і прапанавання, мае тэндэнцыю да паніжэння. Можа, нам і не трэба гэта паніжэнне. Нам стабілізавацца б на гэтым узроўні і падцягваць да яго даходы насельніцтва, і ў гэтых адносінах у нас добрыя тэндэнцыі».

Як далажыла кіраўніку дзяржавы Надзея Ермакова, у сітуацыі на валютным і фінансавым рынках, у банкаўскай сістэме краіны ў цэлым адзначаецца сур'ёзная стабілізацыя.

Што датычыцца змяншэння стаўкі рэфінансавання, кіраўнік Нацбанка канстатавала, што гэта адбылося, найперш, па прычыне зніжэння інфляцыі.

«Рэзка зніжаць стаўку рэфінансавання мы не будзем. І ў той жа час мы пакідаем за сабой права, калі раптам штосьці зменіцца ў цэнах або інфляцыі, стаўку рэфінансавання павысіць. Але сёння сітуацыя складваецца так, што яна рухаецца да паніжэння», — канстатавала кіраўнік Нацбанка.

Аляксандр Лукашэнка даручыў і ў далейшым падтрымліваць стабільнае функцыянаванне банкаўскай сістэмы і своечасова рэагаваць на розныя змяненні і тэндэнцыі ў гэтай сферы.

ПРА ГАЛАВУ І ШЫЮ, альбо Свет трымаецца на ўзаемадзеянні

Ці магчыма пазнаць свет жанчын, ці жанчына кіруе светам і наогул, на чым трымаецца сусвет, разважалі ўдзельніцы «круглага стала», беларускія пісьменніцы і паэтэсы:

Раіса Баравікова: Напэўна, ёсць нешта таемнае, чалавецтву яшчэ невядомае. І магчыма, нават мы, жанчыны, таго не ўсведамляем, што на самой справе ўсім у гэтым жыцці кіруем мы. Не ведаем, што мы захавальніцы таго самага залатога ключыка, які вядзе да святла, да суладдзя, да дабрыні.

Наталля Батракова: Узаемадносіны мужчыны і жанчыны развіваюць цывілізацыю.

Юлія Зарэцкая: Бяспрэчна, жанчына кіруе светам, але кіруе не ў сэнсе ўлады, а ў тым, што ўсё тое, што робіць мужчына, ён робіць дзеля жанчыны. Жанчына стаіць у цэнтры, дзеля яе мужчына нешта робіць, здзяйсняе подзвігі.

Таццяна Сівец: Найперш трэба, каб жанчына кіравала тым светам, што знаходзіцца ўнутры яе самой. Калі яна яго ўпарадкуе, тады будзе здольная кіраваць гэтым светам. Але калі жанчына ў сабе разбярэцца, то навошта ёй іншы свет? Навошта ёй кіраваць фабрыкай і заводам, калі яна і так самадастатковая, цудоўная і ёй захапляюцца?

Раіса Баравікова: Мая бабуля любіла павучаць сваю нявестку, маю маму: «Ты запомні, што мужчына ў доме галава, а жанчына — шыя, якая круціць гэтай галавой».

— Ці варта падзяляць пісьменства на жаночае і мужчынскае?

Яўгенія Пастарнак: Большасць маіх кніг напісана ў суаўтарстве з мужчынам. Калі мы пісалі першую кніжку «М+Ж» (ён ад асобы мужчыны, я — жанчыны), стараліся адзін на аднаго не ціснуць і не заходзіць на іншую палову. Працаваць было вельмі цікава. Я вельмі многаму навучылася. Мы пішам падлеткавую літаратуру, і тут няма дзялення — для хлопчыкаў яна ці для дзяўчынак, яна проста павінна быць цікавай, і не важна, кім яна напісана.

Баравікова: Справа у таленце. Ён аднолькавы для чалавека. Хаця ў літаратурным жыцці жанчыне значна цяжэй. Мужчыны іранічна ставяцца да жанчын-творцаў. Два стагоддзі назад жанчыны нават бралі сабе мужчынскія псеўданімы. Ёсць свет жанчыны, пачуцці, шмат адценняў пачуццяў, на якія мужчыны не здольны. У нас у беларускай літаратуры ёсць жаночыя вобразы, але практычна свет жанчыны не раскрыты.

Батракова: Раней я таксама жыла ў гэтым спаборніцтве мужчыны-жанчыны. І раптам адчула: а навошта спаборнічаць? Я ўзнялася на прыступку вышэй, і мяне ацанілі. Я спачатку перасмыкалася, калі чула «жаночы раман», а цяпер мне гэта падабаецца. Так, жаночы, так, я жанчына, і я гэтым ганаруся.

Запісала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего КТУП «НАРОЧЬ КУРОРТТОРГ»

Лот № 1. Капитальное строение, здание магазина № 12 со складом, инв. № 633/С-10591, общей площадью 41,3 кв.м, стоимостью 18 417 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Занарочский с/с, д. Стаховцы.

Лот № 2. Капитальное строение, здание магазина № 9 со складом, инв. № 633/С-10589, общей площадью 40,7 кв.м, стоимостью 16 731 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Занарочский с/с, д. Черемшицы.

Лот № 3. Капитальное строение, здание магазина, инв. № 633/С-10590, общей площадью 51,3 кв.м, стоимостью 9 804 000 белорусских рублей, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Занарочский с/с, д. Карабаны.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: **http://minsk.court.by/,** а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: **г. Минск, ул. Академическая, 15/1.**

Торги состоятся 20.03.2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: **судебный исполнитель Минец И.Н., тел./факс: 294 93 66; ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда город Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ААН: УРОН АД СТЫХІЙНЫХ БЕДСТВАЎ У СВЕЦЕ ДАСЯГНУЎ РЭКОРДНАГА ЎЗРОЎНЮ

Паводле ацэнак ААН, у 2011 годзе стыхійныя бедствы нанеслі сусветнай эканоміцы беспрэцэдэнтны матэрыяльны ўрон — 380 мільярдаў долараў. Пры гэтым колькасць ахвяр катастроф не павялічваецца. Гэта на дзве траціны больш, чым у рэкордным 2005 годзе, калі па поўдні ЗША пранёсся спусташальны ўраган «Катрына», перадаюць інфармагенцтвы. У першую чаргу матэрыяльныя страты былі звязаны з разбуральнымі землятрусамі ў Японіі і Новай Зеландыі, а таксама паводкамі ў Тайландзе і іншых краінах.

УКРАІНСКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ ЯШЧЭ НА ДВА ГАДЫ ПАКІНУЛІ БЕЗ РАСКОШНЫХ АЎТО

Урад Украіны падоўжыў да 2014 года дзеянне пастановы аб эканоміі бюджэтных сродкаў, якая, у прыватнасці, забараняе чыноўнікам купляць за кошт казны дарагія аўтамабілі. Пра гэта паведамляе прэс-служба кабінета міністраў. Таксама ўстаноўлена абмежаванне на набыццё дзяржслужачымі мэблі, ноўтбукаў, мабільных тэлефонаў і рамонт у рабочых кабінетах. Ва ўрадзе адзначылі, што гэтая пастанова тычыцца як міністэрстваў і ведамстваў, так і іншых дзяржаўных установ.

САМЫМ БАГАТЫМ ЧАЛАВЕКАМ НА ПЛАНЕЦЕ СТАЎ МЕКСІКАНЕЦ КАРЛАС СЛІМ

Мексіканскі мільярдэр Карлас Слім стаў самым багатым чалавекам планеты, паводле рэйтынгу Bloomberg. Яго багацце павялічылася на 11% з пачатку гэтага года і ацэньваецца ў $ 68,6 млрд, паведамляюць інфармагенцтвы. На другім месцы апынуўся амерыканец і заснавальнік Microsoft Біл Гейтс, чые актывы складаюць $ 62,4 млрд і павялічыліся на 11% з пачатку года. На трэцім месцы — Уорэн Бафет з капіталам у $ 43,8 млрд.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЕЎРАКАМІСІЯ ПРЫЗНАЛА ПАЎТОРНУЮ РЭЦЭСІЮ ЕЎРАЗОНЫ

Еўразона ў цяперашні час знаходзіцца ў стане «мяккай рэцэсіі». Пра гэта заявіў еўракамісар па эканамічных пытаннях Олі Рэн.

Як паведамляецца ў прэс-рэлізе Еўрастата, паводле перагледжаных звестак, у чацвёртым квартале 2011 года ВУП еўразоны, як і ўсяго ЕС, скараціўся на 0,3 % у параўнанні з вынікамі ліпеня-жніўня. Такім чынам, па выніках мінулага года эканоміка ЕС вырасла на 1,5 %, еўразоны — на 1,4 %. У адпаведнасці з перагледжанымі звесткамі за чацвёрты квартал 2011 года ў стане рэцэсіі знаходзяцца эканомікі Бельгіі, Нідэрландаў, Чэхіі, Італіі, Партугаліі, Славеніі, Грэцыі.

У канцы студзеня Еўракамісія прадказала еўразоне рэцэсію (спад на працягу двух кварталаў запар), другую за апошнія тры гады. Аналітыкі адзначалі тады, што эканамічнае развіццё валютнага саюза спынілася ў канцы 2011 года. На іх думку, негатыўныя тэндэнцыі будуць назірацца і сёлета, прычым адмоўны рост працягнецца на працягу 12 месяцаў.

КАРАТКА

Амаль 150 спартсменаў з Беларусі і Расіі выступяць на адкрытым чэмпіянаце і першынстве краіны па гарналыжным спорце ў Сілічах. Сёння пройдуць спаборніцтвы па слаламу. Акрамя беларускіх гарналыжнікаў у турніры прымуць удзел дзве каманды з Расіі.

Згодна з пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у краіне ўстаноўлена забарона на паляванне на гусей, канадскую казарку і крыжанку ў некаторых паляўнічых угоддзях падчас сёлетняга веснавога палявання на вадаплаўную дзічыну. З пералікам паляўнічых угоддзяў, на тэрыторыі якіх забаронена паляванне, можна азнаёміцца на сайце Мінпрыроды.

Упраўленнем Следчага камітэта па Мінску затрыманы старшыня назіральнай рады ААТ «Тэхнабанк» Уладзіслаў Кацарэнка. Банкір затрыманы па падазрэнні ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага ч. 6 арт. 16 «Саўдзел у злачынстве» і ч.2 арт. 243 «Ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў» КК Беларусі.

ШТО ПАТРЭБНА ЖАНЧЫНЕ ДЛЯ ШЧАСЦЯ?

Аляксандр Саладуха, спявак:

— Што патрэбна для шчасця? Думаю, перш за ўсё — добры чалавек побач, надзейны мужчына. Пажадана прыгожы. Да гэтага варта дадаць утульны дом і шчаслівых дзяцей. Чаго яшчэ можна жадаць у гэтым жыцці?

Ірына Цыральчук, настаўніца гісторыі Сухопальскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Пружанскага раёна:

— Не буду казаць пра нейкую абстрактную жанчыну. Для мяне асабіста шчасце ёсць шмат у чым. Гэта і калі сонца свеціць, і мандарыны на стале, і снег за акном на Новы год, і смачная кава з шакаладам. Вядома, мае любімыя мама і тата, сёстры, сябры, пачуццё кахання — таксама неверагоднае шчасце. Не варта доўга раздумваць, што ж для гэтага самага шчасця табе патрэбна, лепш шукаць яго ў кожным імгненні жыцця.

Андрэй Пісарык, старшыня Камянецкага райвыканкама:

— Першае, што важна, — здароўе. Гэта галоўнае не толькі для жанчыны, але і для мужчыны. Другое — любіць і адчуваць любоў. Тут маюцца на ўвазе не толькі адносіны пары, каханне, але і разумненне пачуцця любові ў глабальным маштабе. Добра, калі ў жанчыны ёсць сям'я — дзеці і мужчына, якія заўжды дапамогуць і падтрымаюць. Калі з гэтым усё ў парадку, можна лічыць, што маеш ужо нямала прычын назваць сябе шчаслівай. І толькі на чацвёртае месца сярод важных для жаночага шчасця рэчаў я паставіў бы прыгажосць.

Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.

МВФ БУДЗЕ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ІНТЭНСІЎНЫ КАНТАКТ З БЕЛАРУСКІМІ ЎЛАДАМІ

Чарговая місія МВФ скончыла сваю працу ў Беларусі і з'ехала. Але абяцала вярнуцца ў кастрычніку, а можа, па словах кіраўніка місіі Крыса Джарвіса, і раней.

Эксперты МВФ падвялі вынікі сваёй працы ў Беларусі. Прызнана, што ў нашай краіны ёсць добрыя перспектывы для пэўнага аднаўлення эканомікі ў гэтым годзе. Мэтавы паказчык эканамічнага росту на 5% на 2012 год, які базіруецца на высокай дынаміцы эканамічнага росту ў 2011-м, Крыс Джарвіс назваў рэальным, але цяжкадасягальным. Для таго, каб дасягнуць устаноўленых эканамічных паказчыкаў, Беларусі спатрэбяцца вельмі высокія квартальныя тэмпы росту, асабліва ў другім паўгоддзі 2012 года. Гэта проста неабходна, каб у цэлым за год выйсці на пяцірацэнтны прырост ВУП.

Прадстаўнік МВФ лічыць, што дасягненне такога выніку «цяжка будзе ажыццявіць у межах стрымлівання інфляцыі». Аднак, калі дайсці да 5% не атрымаецца, нельга будзе казаць, што палітыка няправільная. «Насамрэч мы лічым, што палітыка, якую праводзяць у цяперашні час, з'яўляецца абгрунтаванай і дае падставы меркаваць, што яна прывядзе да эканамічнага росту ў другім паўгоддзі 2012 года», — заявіў Крыс Джарвіс. Пакуль жа сітуацыя ў Беларусі нармальная, што пацвярджаецца выказваннем прадстаўніка МВФ наконт беларускай плацежаздольнасці: «Я думаю, што Беларусь здольная пагашаць свой доўг перад МВФ і іншымі крэдыторамі». Гэтая ацэнка вельмі важная, бо, нагадаем, у хуткім часе Беларусі трэба будзе выплачваць амаль 6 млрд долараў па знешнім дзяржаўным доўгу.

Эксперт МВФ таксама даў ацэнку апошняму зніжэнню стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі. Джарвіс прытрымліваецца думкі, што зніжэнне стаўкі да 38% гадавых было, магчыма, дачасным. Трэба было пачакаць, пакуль больш трывала ўмацуецца стабільнасць і знізяцца інфляцыйныя чаканні насельніцтва. «Гэта ўсё, безумоўна, зараз назіраецца ў Беларусі, але вельмі важна ўпэўніцца, што такія ўмовы з'яўляюцца раней, чым скарачэнне працэнтных ставак», — падкрэсліў прадстаўнік МВФ.

Дапаможа ва ўмацаванні стабільнасці эканомікі скарачэнне крэдытавання дзяржпраграм. Мінулы год ужо паказаў, што празмернае крэдытаванне эканомікі ў межах дзяржаўных праграм можа спарадзіць праблемы. Крыс Джарвіс ухваліў тое, што сёлета гэтае крэдытаванне не перавысіць 3% ВУП: «Гэта добры мэтавы паказчык, абгрунтаваны».

Эксперт МВФ упэўнены, што пры ўмове правядзення належнай жорсткай палітыкі зніжэнне інфляцыі да 20% (і нават ніжэй) цалкам верагоднае. «Таксама мы чакаем, што эканамічны рост у 2012 годзе будзе дадатным, але менш за 5%». Змякчаць жа палітыку нельга. Гэта можа выклікаць больш высокую інфляцыю.

Дарэчы, пытанне аб манетарным саюзе паміж Расіяй і Беларуссю пакуль што не абмяркоўвалася з удзелам МВФ, заявіў Крыс Джарвіс. «Пакуль размовы аб гэтым няма, інакш мы б ведалі, — сказаў ён. — Па вопыце еўразоны вы можаце бачыць, якія могуць быць праблемы пры дачасным вырашэнні такога пытання».

Акрамя таго, кіраўнік місіі прадставіў журналістам новага прадстаўніка Міжнароднага валютнага фонду, які прыйдзе на змену Наталлі Калядзінай, — Марка Алена, старага пастаяннага прадстаўніка МВФ у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Беларускі офіс МВФ будзе працягваць сваю працу ў поўным фармаце. Наступная місія можа адбыцца ў кастрычніку 2012 года. «Аднак мы можам прыехаць і раней, бо маем намер падтрымліваць інтэнсіўны кантакт з беларускімі ўладамі». А ўвогуле місіі МВФ будуць наведваць Беларусь не радзей за адзін раз у шэсць месяцаў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Прыгожыя і... мужныя

Пры дапамозе грамадзян міліцыянеры Віцебскай вобласці раскрылі летась каля ста злачынстваў. Сярод тых, хто не спужаўся і дапамог затрымаць правапарушальнікаў, ёсць нават падлеткі і жанчыны. На Віцебшчыне становіцца добрай традыцыяй ушаноўваць такіх неабыякавых людзей: у рамках спецыяльнай акцыі «Грамадзянская мужнасць» яны атрымліваюць спецыяльныя дыпломы і памятныя прызы.

Святлана Аверчанкава, Крысціна Старанік і Васіліса Баркоўская.

— Толькі летась пры дапамозе грамадзян было раскрыта каля ста злачынстваў, — расказаў начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама генерал-маёр міліцыі Аляксандр Найдзенка. — Гэта сапраўдныя прыклады мужнасці. Людзі не спалохаліся небяспекі і дапамаглі міліцыі затрымаць злачынцаў па гарачых слядах. Міжвольна ўзнікае пытанне: а калі б мы аказаліся на іх месцы — змаглі б зрабіць тое ж самае?

Дзяўчынкі супраць злачынцы

27-гадовы жыхар Верхнядзвінскага раёна, праходзячы па двары аднаго з дамоў, убачыў пажылую жанчыну, якая несла ў руках сумку. Падбег да яе, выхапіў сумку і ўцёк. Жанчына пачала клікаць на дапамогу. Да яе падышлі дзве дзяўчынкі — Крысціна Старанік і Васіліса Баркоўская, вучаніцы 7 «Б» класа школы № 17 Віцебска. Яны дапамаглі жанчыне падняцца і пабеглі за мужчынам. Калі прыехалі міліцыянеры, дзяўчынкі расказалі, што злодзей схаваўся ў парку Чыгуначнікаў. І ўзяліся паказаць, дзе менавіта. Праязджаючы па парку ў патрульнай машыне, школьніцы ўбачылі таго самага грамадзяніна. Міліцыянеры затрымалі мужчыну і даставілі ў Чыгуначны РАУС горада Віцебска.

Не разгубілася

Святлане Аверчанкавай патэлефанаваў сусед па дачы, сказаў, што трапіў у бальніцу і папрасіў зазірнуць да яго на ўчастак — паглядзець, ці ўсё там нармальна. Падыходзячы да агароджы, жанчына заўважыла сляды, якія вялі да дома. Святлана Аляксандраўна якраз трымала ў руках малаток, таму смела рушыла далей. Метра ў за пяць ад уваходных дзвярэй яна ўбачыла мужчыну, які, заўважыўшы яе, забег у дом. Адважная жанчына пайшла за ім і штурхнуўшы з усіх сіл, змагла затрымаць злодзея! У доме Святлана Аляксандраўна заўважыла, што тэлевізар суседа ўжо быў спакаваны ў посцілку, як і іншыя рэчы. Жанчына выклікала міліцыю, а міліцыянеры даставілі затрыманага ў Чыгуначны РАУС г. Віцебска.

Ёй і іншым смельчакам начальнік УУС генерал-маёр міліцыі Аляксандр Найдзенка ўручыў граматы і каштоўныя падарункі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У БЕЛАРУСІ МОГУЦЬ З'ЯВІЦЦА НЕДЗЯРЖАЎНЫЯ КАМПАНІІ, ЯКІЯ БУДУЦЬ ЗАЙМАЦЦА САЦЫЯЛЬНЫМ АБСЛУГОЎВАННЕМ НАСЕЛЬНІЦТВА

Беларускімі дэпутатамі на вясновай сесіі ў першым чытанні будзе разгледжана новая рэдакцыя закона «Аб сацыяльным абслугоўванні насельніцтва». Законапраектам прадугледжана, што сацыяльным абслугоўваннем насельніцтва на конкурснай аснове змогуць займацца і дзяржаўныя, і недзяржаўныя арганізацыі.

«Неабходна, каб у гэтай сферы была магчымасць выбару арганізацыі, якая прадстаўляе сацыяльныя паслугі», — пераканана намесніца старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Зінаіда Мандроўская. «Грамадства развіваецца па ўзыходнай спіралі, яго патрэбы становяцца шырэй, і неабходна забяспечыць усе яго заяўкі, — сцвярджае дэпутат. — Таму ў законе пашыраны спектр сацыяльных паслуг, якія будуць прапаноўвацца людзям. Акрамя таго, у грамадстве павялічваецца доля пажылых людзей, якім патрэбен догляд, як на бязвыплатнай, так і на часткова платнай аснове. Значыць, да рэалізацыі сацыяльнага абслугоўвання трэба прыцягнуць валанцёраў і ўсе арганізацыі, незалежна ад формы ўласнасці».

Недзяржаўныя арганізацыі змогуць прыняць удзел у сацыяльных праектах, якія будуць суфінансавацца дзяржавай. Гэтыя праекты будуць ахопліваць розныя сферы жыцця і ўключаць у сябе аказанне інфармацыйных, сацыяльна-бытавых, сацыяльна-педагагічных, сацыяльна-псіхалагічных паслуг і інш. Умовы фінансавання дзяржавай будуць аб'яўляцца падчас правядзення конкурсу. Як лічыць Зінаіда Мандроўская, прыняцце законапраекта дасць магчымасць хутка развівацца ўсім кампаніям, незалежна ад формы ўласнасці, якія плануюць займацца сацыяльным абслугоўваннем насельніцтва.

Святлана БУСЬКО.

РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ ЗАМЕСТ УРОКАЎ

Перанос рабочага дня з пятніцы 9 сакавіка на нядзелю 11 сакавіка паставіў пад пытанне ўдзел старшакласнікаў у рэпетыцыйным тэсціраванні. Згодна з зацверджаным графікам, менавіта 11 сакавіка ў многіх ВНУ павінна было прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне па экзаменацыйных дысцыплінах. Як вядома, працэдура гэта платная — здача адной дысцыпліны каштуе 30 тысяч рублёў. Да таго ж будучыя абітурыенты імкнуцца загадзя зарэгістравацца для ўдзелу ў «рэпетыцыі» ўступных экзаменаў, тым больш што зараз у краіне праходзіць апошні (трэці) раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання. Таму парушаныя планы многім сапсавалі настрой.

— У Міністэрства адукацыі таксама паступалі ад абітурыентаў аналагічныя пытанні, — паведаміла журналісту «Звязды» прэс-сакратар міністра адукацыі Юлія Ваніна. — Таму мусім усіх заспакоіць: навучальным установам прадастаўлена права (з улікам іх спецыфікі) перанесці рабочы дзень у іншым парадку.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС № 1109523 считать недействительным. УНП 101883943

ЛЁГКАЯ ПРАСТУДА — НЕ ПАДСТАВА ДЛЯ ЗВАРОТУ Ў ПАЛІКЛІНІКУ?

Летась на кожнага беларуса прыйшлося 13,2 наведвання амбулаторна-паліклінічных устаноў, што ў 2,2 раза перавышае аналагічны паказчык у краінах Еўрасаюза і ў 1,6 раза — паказчык краін СНД. Ці варта здзіўляцца бясконцым чэргам у калідорах нашых паліклінік? Аднак ёсць даволі вялікая колькасць людзей, якія звяртаюцца ў паліклініку толькі ў крайнім выпадку, таму што нават банальная прастуда цягне за сабой як мінімум выклік урача дамоў, адно ці два наведванні паліклініке плюс здачу аналізаў, флюараграфію і гэтак далей. Не ў кожнага на такое «лячэнне» хапае запасу цярплівасці і здароўя! А чаму б не скарыстацца досведам многіх замежных краін, дзе ў хворага з прастудай ёсць законнае права проста адляжацца некалькі дзён дома без звароту да ўрача. Галоўнае — паведаміць пра хваробу свайму наймальніку. У Беларусі да такой практыкі прыбягаюць замежныя кампаніі, прадстаўніцтвы і прыватныя фірмы. У іх ёсць своеасаблівы гадавы рэзерв (пэўная колькасць дзён), якімі работнік можа скарыстацца без звароту ў медыцынскія ўстановы. Прычым заробак на гэты час за імі захоўваецца.

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль ТОЗІК таксама лічыць, што не трэба прымушаць людзей звяртацца ў паліклініку па кожную даведку. Сёння лісток непрацаздольнасці аплачваецца за кошт сродкаў Фонду сацыяльнага страхавання: «А калі б першыя тры дні хваробы аплачваліся за кошт сродкаў наймальніка, то, магчыма, і зваротаў у паліклінікі стала б менш?»

Медыкі канстатуюць: наш менталітэт сур'ёзна адрозніваецца ад менталітэту жыхароў заходнееўрапейскіх краін, дзе людзі імкнуцца як мага хутчэй вылечыцца, таму што там сацыяльны статус чалавека наўпрост залежыць ад стану яго здароўя. А ў нас, як ні сумна гэта канстатаваць, хварэюць людзям выгадна, бо фактычна чалавек, седзячы дома, атрымлівае сваю сярэднямесячную заработную плату. Дык навошта, скажыце, яму «ўдарнымі тэмпамі» выздараўліваць? З 2006 па 2011 год часовая непрацаздольнасць насельніцтва вырасла ў краіне на 21%. Між іншым, сёння да 80% у структуры часовай непрацаздольнасці займаюць захворванні верхніх дыхальных шляхоў.

Калі ў адной са сталічных паліклінік правялі анкетаванне пацыентаў, каб высветліць, з якой мэтай пацыенты прыйшлі на прыём да ўчасткавага ўрача, то пераканаліся, што на першым месцы знаходзяцца зусім не пытанні пастаноўкі дыягназу, лячэння і абследавання (на гэта прыпала толькі 30-40% ад агульнай колькасці наведванняў), а медыка-сацыяльныя пытанні (узяць лісток непрацаздольнасці, выпісаць ільготны рэцэпт, аформіць групу інваліднасці, атрымаць накіраванне для санаторна-курортнага лячэння і г.д.) .

У Міністэрстве аховы здароўя таксама думаюць над тым, як зменшыць нагрузку на амбулаторна-паліклінічнае звяно. Адзін з захадаў, прапанаваных галоўным медыцынскім ведамствам, — даць урачам права выдаваць пацыентам лісткі непрацаздольнасці тэрмінам да 10 дзён.

« ...платныя паслугі не павінны падмяняць гарантаваную медыцынскую дапамогу, якая аказваецца пацыентам на бюджэтнай аснове»

— Разам з тым мерапрыемствы, якія носяць міжгаліновы характар, мякка кажучы, не знаходзяць разумення ў зацікаўленых, у тым ліку ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, — заявіў на выніковай калегіі свайго ведамства **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО.** — Гаворка ідзе, у прыватнасці, пра выдачу лістка непрацаздольнасці тэрмінам да 10 дзён і прызначэнне дапамог па часовай непрацаздольнасці за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай аховы і наймальніка. Мы прапануем таксама зменшыць памеры выплат да 30% пры часовай непрацаздольнасці, якая ўзнікала па прычыне алкагольнага ап'янення, і кампенсаваць арганізацыям аховы здароўя выдаткі на аказанне медыцынскай дапамогі асобамі, якія нанеслі шкоду свайму здароўю ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, які быў выкліканы спажываннем наркатычных, псіхатропных ці таксічных рэчываў. Аднак і гэтыя прапановы не знаходзяць падтрымкі ў нашых калег з іншых галін, а прапановы з вышэйшых органаў кіравання па ўвядзенні страхавой медыцыны, у тым ліку з жорсткай рэгламентацыяй аб'ёмаў гарантаванай бюджэтнай дапамогі, патрабуюць шырокага абмеркавання, паколькі закранаюць сацыяльныя гарантыі для насельніцтва.

Па словах міністра, дыспансэрнымі аглядамі ў 2011 годзе было ахоплена амаль 99% працаздольнага насельніцтва:

— Разам з тым, мушу канстатаваць, што дыспансэрызацыя праводзіцца часта фармальна, выключна дзеля лічбаў, што пацвярджаецца ростам смяротнасці насельніцтва ў працаздольным узросце. Лічу, што прычыны фармалізму крыюцца ў недастатковай арганізацыі работы ўчасткавага ўрача і медыцынскай сястры. Неабходна дэлегаваць участковым урачам больш правоў і абавязкаў. Трэба спыніць непатрэбны кантроль за іх работай, а замест гэтага патрабаваць канкрэтных вынікаў іх дзейнасці і ўзмацніць прафілактычную накіраванасць у іх рабоце.

— Летась аб'ём аказаных платных медыцынскіх паслуг склаў амаль 780 млрд рублёў. Платныя медыцынскія паслугі трэба развіваць і далей, але ў той жа час мы не павінны пераўтвараць медыцыну ў платную, — падкрэсліў Васіль Жарко. — Рост аб'ёму платных медыцынскіх паслуг не павінен суправаджацца ростам цэн на іх, а платныя паслугі не павінны падмяняць гарантаваную медыцынскую дапамогу, якая аказваецца пацыентам на бюджэтнай аснове.

Як вядома, адным з індыкатараў дзейнасці сістэмы аховы здароўя з'яўляюцца звароты грамадзян. Усяго летась у міністэрства паступіла 5 276 пісьмовых зваротаў (на 14% менш, чым у папярэднім), у тым ліку 850 зваротаў з падзякай. І 2726 зваротаў паступілі на «гарачую» тэлефонную лінію міністэрства. Па выніках разгляду зваротаў грамадзян у 260 выпадках на медработнікаў былі накладзеныя дысцыплінарныя спагнанні.

— Не магу не звярнуць увагу ўсіх работнікаў сістэмы аховы здароўя на неабходнасць захавання асноў прафесійнай этыкі і дэанталогіі паміж калегамі, і перш за ўсё — у зносінах з пацыентамі. У выпадку прадузятых, нетактычных паводзін, грубасці да пацыентаў з боку медыцынскіх работнікаў трэба неадкладна прыцягвць такіх асоб да дысцыплінарнай адказнасці, — дадаў Васіль Жарко. — Маніторынг на месцах сведчыць аб шматлікіх праблемах у гэтым напрамку, прычым недапрацоўкі ёсць ва ўсіх без выключэння рэгіёнах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АБЗАЦ

◢ У Беларусі ордэнам Маці ўзнагароджана 6 тыс. 891 жанчына, якая нарадзіла і належна выхавала пяцёра і больш дзяцей.

◢ **Рэспубліканская дэкада «Дзяржтэхагляд» пройдзе ў Беларусі з 20 па 30 сакавіка. Супрацоўнікі «Белтэхагляду», Дзяржаўтаінспекцыі і Транспартнай інспекцыі Мінтранса будуць асабліва строгімі да тых аўтаўладальнікаў, аўтамабілі якіх не прайшлі своечасова дзяржаўны тэхнічны агляд.**

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ Галандскія дызайнеры Эрык дэ Нійс і Цім Сміт з кампаніі Nieuwe Heren стварылі джынсы, абсталяваныя рабочай клавіятурай, «мышшу» і навушнікамі. Усё гэта інтэгравана ў верхнюю частку штаноў. Джынсы руч-

нога вырабу закліканы даць карыстальніку свабоду руху падчас працы за камп'ютарам. У іх гнуткая клавіятура, а важаць яны крыху больш за звычайныя, бо ўсе аксесуары — мініяцюрныя. Сэнс вынаходніцтва — у тым, каб мець магчымасць карыстацца камп'ютарам і пры гэтым не сядзець у замкнёнай прасторы за сталом.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

■ Пасля пісьма

«АДНАВІЦЬ СЯДЗІБУ ДАСТАЕЎСКІХ»

ПАД ТАКІМ ЗАГАЛОЎКАМ У НУМАРЫ ЗА 31.01.2012 г. БЫЎ ЗМЕШЧАНЫ ЛІСТ СПАДАРА СЯНЮТЫ З МІНСКА

У адказ на яго намеснік старшыні Іванаўскага райвыканкама Я. Дарагакупец паведаміў, што работа па прапагандзе творчай спадчыны класіка рускай літаратуры Ф.М. Дастаеўскага ў раёне вядзецца даўно, пытанне аднаўлення сядзібы роду Дастаеўскіх прапрацоўваецца з 2010 года. Даслоўна: 20 кастрычніка 2010 г. раённы выканаўчы камітэт звярнуўся з просьбай у Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт аб хадайніцтве ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўнясенні прапаноў выканаўчаму камітэту Саюзнай дзяржавы аб фінансаванні работ па аднаўленні сядзібы Дастаеўскіх.

У студзені 2012 г. накіраваны заяўкі і праект каштарысу на фінансаванне з бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2013 год работ па аднаўленні гэтага аб'екта. Аб'ём фінансавання з бюджэту Саюзнай дзяржавы будзе складаць 76,9 млн расійскіх рублёў, у тым ліку доля расходаў Расійскай Федэрацыі складае 50,0 млн расійскіх рублёў, доля расходаў Рэспублікі Беларусь — 26,9 млн расійскіх рублёў.

На падставе даручэння прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь М.У. Мясніковіча ад 19.01.2012 № 05/205-108 для прапрацоўкі пытання аб аднаўленні сядзібы Дастаеўскіх унесены прапановы па заданні на праектаванне, эскізным вырашэнні па знешнім абліччы сядзібы, прыкладным наборы памяшканняў для экспазіцыі, канцэпцыі музея.

Раённы выканаўчы камітэт падтрымлівае ідэю аўтара артыкула аб стварэнні Фонду Дастаеўскага і лічыць, што фонд павінен быць створаны на рэспубліканскім узроўні — пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь або Міністэрстве спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

Са свайго боку, Іванаўскі раённы выканаўчы камітэт гарантуе самы актыўны ўдзел у стварэнні і працы фонду, а таксама ва ўсіх мерапрыемствах, звязаных з імем вялікага пісьменніка.

Адноўленая сядзіба Дастаеўскіх будзе выкарыстоўвацца не толькі як музейны комплекс, але і як турыстычны цэнтр з забеспячэннем турыстаў пазнавальнай праграмай і магчымасцю ўдзелу ў паляванні, рыбалцы, фальклорных святах і іншых мерапрыемствах.

■

ЗАЧАРАВАНЫ ДЗВІНОЮ

95 ЗВЯЗДА

Сто гадоў таму нарадзіўся Тарас Хадкевіч — пісьменнік, перакладчык, публіцыст, крытык, заслужаны работнік культуры і, дададзім, звяздовец. У нашай газеце Тарас Канстанцінавіч працаваў з 30-х гадоў.

Захаваліся ўспаміны супрацоўнікаў пра тое, што ў студзені 1931 года «Звязда» пачала выдаваць газету «Рабселькор», куды «сцягваліся» лепшыя маладыя журналісты з раённага і шматтыражнага друку, якія «ўжо мелі вопыт і маглі сяму-таму павучыць іншых». Сярод іх быў і працавіты журналіст і пачынаючы пісьменнік Тарас Хадкевіч.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў якасці камандзіра ўзвода Тарас Канстанцінавіч удзельнічаў у баях, быў цяжка паранены і апынуўся ў палоне, адкуль уцякаў і патрапіў у атрад Супраціўлення ў Чэхаславакіі. Пасля вайны Тарас Хадкевіч зноў на журналісцкім пасту: да 1950 года працуе ў «Звяздзе», пасля — у «ЛіМе».

Варта прыгадаць, што Тарас Канстанцінавіч з'яўляўся членам літаратурна-мастацкага аб'яднання «Маладняк». Праўда, у параўнанні з многімі вядомымі «маладнякоўцамі» ён напісаў не так шмат, але пры гэтым паспеў скажаць сваё слова пра прыгажосць нашай зямлі. Колькі ўзнёслых і шчырых радкоў у яго кнізе «Песня Дзвіны»! Некалькі зборнікаў апавяданняў Хадкевіча прысвечаны дзецям, некаторыя з іх можна знайсці ў сучасных хрэстаматыях для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Варта ўзгадаць і пра кнігі і нарысы Хадкевіча, прысвечаныя Беларусі і Мінску, некаторыя з якіх напісаны ў суаўтарстве з іншымі пісьменнікамі.





Пасведчанне журналіста «Звязды».

Як журналіст і пісьменнік Тарас Хадкевіч пісаў пра тое, як расце і развіваецца Беларусь, пра жыццё калгаснай вёскі і пра новабудоўлі. Сяргей Грахоўскі назваў яго «нафтабудоўскім земляком» , калі падпісаў кнігу, якую падарыў Тарасу Канстанцінавічу.

Кнігі з дароўнымі надпісамі можна пабачыць у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, дзе зараз ладзіцца выстава, прысвечаная 100-годдзю Тараса Хадкевіча. Прадстаўлены выдадзеныя ў розныя гады творы пісьменніка, фотаздымкі, асабістыя рэчы і дакументы, у тым ліку і журналісцкае пасведчанне «Звязды», а таксама ліставанне сяброў-землякоў: Тараса Хадкевіча і Алеся Савіцкага.

— Так, ёсць пісьменнікі,чые імёны на слыху, але колькі яшчэ аўтараў таксама ўпісалі свае старонкі ў гісторыю літаратуры, — заўважае загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Вольга Гулева. — Тарас Канстанцінавіч напісаў няшмат, але трэба ўлічваць, што ён мала пражыў, адышоў у 62 гады. Акрамя таго, ён быў журналістам, літкансультантам. Ён вельмі шмат ездзіў па Беларусі і пісаў пра людзей, якія робяць гісторыю, шмат энергіі ўкладаў у працу з маладымі пісьменнікамі. Напрыклад, на выставе прадстаўлена кніга з дароўным надпісам У. Дубоўкі, дзе пісьменнік называе Хадкевіча «першым чытачом маім спагадным (яшчэ ў рукапісе) — многіх казак» — **А.Д.**). Усё гэта забірала час. У адным са сваіх лістоў Алесю Савіцкаму ён прызнаецца, што праца паглынае яго, што не паспявае пісаць, рукапісы ляжаць у стале. Сёння імя Тараса Хадкевіча мала хто ведае. Стагадовы юбілей — гэта магчымасць узгадаць імя чалавека, які пакінуў след у гісторыі літаратуры. Ці чытае сёння хто іх кнігі? Мы разумеем, што час бяжыць наперад, але ж штосьці можна пагартаць і з кніг гэтых пісьменнікаў, таму што чалавечыя пачуцці засталіся ўсё тыя ж. Напрыклад, «Песня Дзвіны» Хадкевіча — кніга, напісаная душой.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Вяртанне

Выстава, прысвечаная Тарасу Хадкевічу, ладзіцца ў межах праекта «Дыяменты прыгожага пісьменства», мэта якога паказаць прыгажосць беларускага слова і ўзгадаць (а часам і выцягнуць з небыцця) імёны пісьменнікаў, якім спаўняецца сто гадоў. Прычым на выставах, што ладзяцца ў межах гэтага праекта, наведнікі змогуць убачыць экспанаты, якія раней ніколі не выстаўляліся.

Напрыклад, на выставе, прысвечанай Тарасу Хадкевічу, упершыню наведвальнікі могуць убачыць яго лісты да Алеся Савіцкага.

Зараз рыхтуецца матэрыял для экспазіцыі да 100-годдзя Пятра Бітэля. У фондах музея ёсць цікавыя рэчы, звязаныя з гэтым пісьменнікам, рэпрэсаваным у 50-х гадах. У выгнанні ён перакладаў творы Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод» і «Пан Тадэвуш», у музеі захоўваюцца рукапісы гэтых перакладаў, зробленых на шпалерах і іншай «падручнай» паперы.

Дарэчы, у фондах БДМГБЛ захоўваецца каля 55 тысяч адзінак музейных прадметаў: гэта і рукапісы, і дакументы, і кнігі з аўтографамі, і асабістыя рэчы пісьменнікаў.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ДАРОГІ НА СВЯТА — ПАД АСАБЛІВЫ КАНТРОЛЬ

У сувязі з павелічэннем транспартных патокаў у выхадныя і святочныя дні, з 15.00 8 сакавіка па 23.00 10 сакавіка Дзяржаўтаінспекцыя арганізуе масіраваную адпрацоўку аўтамабільных дарог М6 (Мінск — Гродна — граніца РП) і М7 (Мінск — Ашмяны — граніца Літвы).

Як паведамілі ва УДАІ МУС, супрацоўнікі ДПС будуць арыентаваны на спыненне парушэнняў дарожнага руху, якія цягнуць за сабой найбольш цяжкія наступствы: з боку кіроўцаў — кіраванне нападпітку, перавышэнне хуткасці, выезд на сустрэчную паласу, ігнараванне рамянёў бяспекі; з боку пешаходаў — пераход дарогі ва неўстаноўленых месцах, знаходжанне на праезнай частцы нападпітку, без флікераў. Спецпадраздзяленне ДПС «Страла» будзе адпрацоўваць Лідскі, Барысаўскі, Слуцкі, Салігорскі і Мінскі раёны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК УЛАДКАВАЦЬ ДЗІЦЯ Ў САДОК?

7 сакавіка Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама праводзіць дзень інфармавання гараджан па праблеме ўладкавання дзяцей у дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

Свае пытанні мінчане змогуць задаць, патэлефанаваўшы ў кантакт-цэнтр Мінгарвыканкама па тэлефоне «142» з 10.00 да 12.00. Кансультаваць бацькоў малых будуць начальнік аддзела дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі Камітэта па адукацыі Таццяна Харужая і галоўны спецыяліст аддзела дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі Ганна Астроўская.

9 САКАВІКА Ў ПАЛІКЛІНІКАХ... «СУБОТА»

У сувязі з пераносам рабочага дня з 9 на 11 сакавіка былі ўнесены змяненні і ў графік работы ўстаноў аховы здароўя. Так, амбулаторна-паліклінічныя арганізацыі будуць працаваць 8 сакавіка па графіку святочнага дня, 9 і 10 сакавіка — па графіку суботы і 11 сакавіка — па графіку рабочага дня.

Работа бальнічных устаноў будзе арганізавана 8 сакавіка — па графіку святочнага дня, 9 сакавіка — па графіку рабочага дня, 10 сакавіка — па суботнім графіку і 11 сакавіка — па графіку выхаднога дня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ХЛОПЕЦ УПАЎ ПАД ПОЕЗД НА СТАНЦЫІ МЕТРО «КУНЦАЎШЧЫНА»

На жаль, гэта ўжо далёка не першы выпадак з пачатку года, калі ў сталічным метрапалітэне на рэйкі па розных прычынах трапляюць людзі. Прычым літаральна ў мінулым нумары мы пісалі пра аналагічнае здарэнне, што адбылося на станцыі «Партызанская» другой лініі падземкі: па прычыне пагаршэння самаадчування з платформы на пуці звалілася 24-гадовая дзяўчына з Мазыра. На шчасце, яна засталася жывой, толькі атрымала чэрапна-мазгавую траўму.

Чарговае падзенне было зафіксавана 6 сакавіка каля 11 гадзін на станцыі «Кунцаўшчына». Гэта рэдакцыі «Звязды» пацвердзіў прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Віталь Дэмбоўскі. Дапамога выратавальнікаў не спатрэбілася: да іх прыезду хлопца, якому на выгляд было за 20 гадоў, дасталі з пуцей работнікі метрапалітэна. Па сведчанні відавочцаў, ён апынуўся пад першым вагонам поезда, які ад'язджаў ад платформы. Падзенне заўважылі, і рух быў спынены. Хлопец быў жывы, яго шпіталізавалі з папярэднім дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма»: у пацярпелага была разбіта галава. Прычыны здарэння высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

7 сакавіка 2012 г. № 5 (277)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Кожны двор і кожны дом

Марына ХІДДЖАЗ

«Вясновыя клопаты Саветаў» — так можна было б акрэсліць тэму нашай размовы са старшынёй Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімірам Марыновічам. Хаця, зразумела, калі гаворыш пра штодзённыя пытанні, якімі займаюцца органы мясцовага кіравання, за строга акрэсленыя межы выйдзеш абавязкова. Жыццё, як звычайна, не ўпісваецца ў рамкі.

Фота Марыны ХІДДЖАЗ.

— Пытанне добраўпарадкавання для нас адно з самых надзённых, — расказвае Уладзімір Мікалаевіч. — Як і належыць, па кожнай вёсцы ва ўсіх дзесяці сельсаветах і Фаніпальскім гарадскім у нас распрацаваны планы па добраўпарадкаванні. Вызначаем аб'ёмы работ па замене агароджы (адзінокім, малазабяспечаным, інвалідам з апалатай такой замены дапамогуць сельскія Саветы). Непасрэднае дачыненне да добраўпарадкавання мае знос старых дамоў — выяўляе іх спецыяльная камісія, у склад якой уваходзяць старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў. Да вясны мы перагледзелі замацаванне тэрыторый, удакладнілі, хто і за які кавалак зямлі адказвае: дзе — клуб, дзе — магазін, дзе — прыватнік. Маглі ж з'явіцца і новыя ўладальнікі...

Як высветлілася падчас гутаркі з Уладзімірам Марыновічам, злабадзённае пытанне для дзяржынскіх дэпутатаў — падтрымка асабістых падсобных гаспадарак. Мясцовыя Саветы лічаць неабходным павялічыць пасевы збожжавых і бульбы вяскоўцаў у палях севазвароту — гэта значыць, на землях, арандаваных насельніцтвам у гаспадарак. Імкнуцца, напрыклад, да таго, каб не менш за 20 працэнтаў збожжавых насельніцтва былі пасеяны менавіта на такіх палях. Іх і апрацоўваць расцей разам з пасевамі гаспадаркі і яе ж тэхнікай. А яшчэ гаспадарка можа дапамагчы вяскоўцу насеннем. Усё — за частку будучага ўраджаю.

Да таго ж клапоцяцца мясцовыя Саветы дэпутатаў і пра тое, каб свойская жывёла была забяспечана пашамі, і каб пасвіць яе было каму. Уласнай жывёлы цяпер у вёсках мала, таму гаспадару трэба ўжо вельмі часта наглядаць за вясковым статкам. Тут бы электрапастухі дапамаглі! У мінулы сезон, праўда, на гэта пайшлі толькі дзве гаспадаркі — ААТ «Баравое-2003» і філіял «Праўда-Агра» агракамбіната «Дзяржынскі». Яны і ваду для кароў падвозілі. Вось і вырашана ў раёне такі станоўчы вопыт пашырыць, і ў сельскіх Саветах добра разумеюць неабходнасць яго распаўсюджвання.

Але, бадай, адзін з самых вялікіх клопатаў у дзяржынскіх дэпутатаў, як і ў многіх раённых службаў, — прафілактыка пажараў. Мінулы год у гэтым сэнсе, шчыра кажучы, не парадаваў: больш за шэсцьдзясят пажараў у раёне, дваццаць загінулых. Ёсць ахвяры агню і сёлета. Справа гэта вельмі сур'ёзная. Нешта не дагледзелі раней?

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДРАДЖАЕМ ГЛЫБІНКУ

«РУЖЫЛОНА» ЗАМЕСТ СТАРОЙ КАРЧМЫ,

або Як прадпрымальніца гістарычны будынак ратавала

У самым цэнтры Ружан, на вуліцы Леніна, стаіць двухпавярховы будынак — прадстаўнік тыповай гарадской забудовы другой паловы XIX стагоддзя. Апошнія гадоў 30-40 тут была гасцініца мясцовага жыллёва-камунальнага прадпрыемства. Невялічкія цесныя нумары, якія даўно не бачылі рамонту, вузкія калідоры, выгоды — толькі на першым паверсе, — вось і ўвесь пералік сэрвісу, які прапаноўваўся кліентам.

Вядома, такі гатэль у сучасных умовах не можа апраўдаць сваё існаванне. І кіраўнікі ЖКГ нічога не мелі супраць таго, каб пазбавіцца ад лішняга клопату. А потым з'явіліся чуткі, што нехта выказаў прапанову наогул знесці старую пабудову, а на яе месцы з дапамогай інвестара ўзвесці новы аб'ект. Тым больш што дом ні ў якіх дакументах не значыўся як гістарычная ці культурная каштоўнасць. І невядома, які лёс напаткаў бы гэты будынак, калі б не ўраджэнка пасёлка, а цяпер мінчанка Святлана Бялько.

Яшчэ ў 1996 годзе Святлана ўзяла ў арэнду памяшканне на першым паверсе названага будынка і адкрыла там прадуктовую краму. Гэта была першая ластаўка прыватнага гандлю ў Ружанах. Раней, калі Святлана прывозіла да сваёй маці дачку на лета, абавязкова прыхоплівала са сталіцы вялікую сумку з прадуктамі. Тады не раз узнікала пачуццё несправядлівасці: чаму ў Мінску ёсць усё, а ў правінцыі нават якіх-небудзь круп купіць — праблема. Такое спачатку падсвядомае, а потым і свядомае жаданне наблізіць гандаль роднага пасёлка да ўзроўню сталічнага і падштурхнула адкрыць сваю краму. Так з'явілася прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Профіт юніан». Аснову яго складае крама — невялікая, але вельмі багатая на асартымент. Тут і танная малочная прадукцыя, і каўбасныя вырабы па вельмі дэмакратычных цэнах, і ўсё астатняе, што трэба кожнай гаспадыні штодзень. Вольга Андрос, загадчыца крамы, калі трэба, падмяняе любога прадаўца. Яна ж ажыццяўляе ўсе стасункі з вытворцамі і пастаўшчыкамі тавару. Многія прадукты прадпрыемства атрымлівае непасрэдна ад вытворцаў. На «Профіт юніан» занята каля дзесяці чалавек. Працуе крама стабільна, у яе склаўся свой асяродак пастаянных пакупнікоў. Гаспадыня з'яўлялася тут час ад часу, і гэтага хапала.

А калі Святлана даведалася, што пабудова з часам можа наогул знікнуць, у яе нарадзілася ідэя купіць гасцініцу, адрамантаваць і вярнуць да жыцця ў новай якасці. Раённыя ўлады пачынанне падтрымалі. Купля адбылася на аўкцыёне, які праводзіў абласны фонд дзяржаўнай маёмасці. З крэдытам дапамог Белаграпрамбанк. Яшчэ некаторы час заняла працэдура афармлення дакументаў. І год таму гаспадыня «Профіт юніан» зарэгістравала яшчэ адно прадпрыемства — «Ружылона». Апошняе займаецца менавіта новай гасцініцай, якая размешчана на другім паверсе будынка. Захаванне профілю ўстановы было адной з умоў продажу. Тым больш што ў гарадскім пасёлку Ружаны іншага гатэля на той час не было. Цяпер, праўда, пачалося ўзвядзенне яшчэ адной прыватнай гасцініцы недалёка ад возера Паперня.

Большасць з 10 нумароў «Ружылоны» ўжо адрамантаваны і абстаўлены новай мэбляй. Яны ўяўляюць сабой маленькія ўтульныя пакоі, дзе ёсць усё неабходнае. Атрымалася цалкам прыстойнае месца адпачынку эканом-класа. Адначасова тут могуць прыняць 21 госця. І апошнім часам паслугі набываюць актуальнасць: ідзе рэстаўрацыя Ружанскага палаца Сапегаў, усё больш турыстаў наведвае тутэйшыя мясціны. Летам іх колькасць павялічыцца. Вядома ж, некаму спатрэбіцца спыніцца. Асабліва для маладых, не вельмі патрабавальных вандроўнікаў такі начлег бачыцца самым прымальным варыянтам. Ды і цяпер, зімой, гасцініцай карыстаюцца будаўнікі, якія працуюць на сельгасаб'ектах.

Але галоўны праект Святланы Бялько, звязаны з яе набыткам, — кавярня ў падвальным паверсе. Сутарэнні (праўда, пакуль завалены ўсялякім смеццем і адходамі будматэрыялаў) уяўляюць сабой даволі прасторнае памяшканне з авальнымі зводамі. У нас з цягам часу з'явіцца стыльны пункт грамадскага харчавання. Пакоі ж будуць стылізаваны пад даўніну. Тут ёсць вялікае поле для фантазіі: як лепш размясціць сталы, якое прыдумаць асвятленне, інтэр'ер. Усё гэта пакуль «выспявае» ў галаве гаспадыні.

Кавярня ў пасёлку вельмі патрэбна. Лік наведнікаў музея ў Ружанскім палацы ідзе ўжо на дзясяткі тысяч, а прыстойнага пункта грамадскага харчавання ў Ружанах няма. Прыстойнага ў тым сэнсе, каб паказаць і сэрвіс на ўзроўні, і сваю адметную нацыянальную кухню, — усё, чым можна прывабіць турыста.

Ну а «разынкай» новай установы Святлана думае зрабіць яе гісторыю. Трэба ж надаць новай кавярні і пэўны рамантычны каларыт. Праўда, дакументальных звестак пра былое пабудовы няшмат. Самы ранні дакумент датаваны 1917 годам. Але знайшліся старыя фотаздымкі, на якіх пазначана, што значна раней тут была карчма. Старэйшыя жыхары Ружан расказвалі, што падчас акупацыі ў сутарэннях немцы размяшчалі свой штаб. Сцены тут надзвычай тоўстыя, для штаба, відаць, лепшага ў плане бяспекі месца і не патрабавалася. Пошукі працягваюцца. Святлана ўпэўнена, што знойдзе яшчэ нямала цікавых звестак пра былое гасцініцы. А на вясну і лета ў яе запланаваны рамонт фасада будынка і замена даху.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пружанскі раён.

СВОЙ ПОГЛЯД

А Свіркі не горшыя!

Чаму людзей трэба абавязкова сяліць у аграгарадках, а потым вазіць на працу?

Найперш папярэджу, што пішу ў сваю любімую газету зусім не для таго, каб некага крытыкаваць. Пішу, каб падзяліцца болем — за сваю вёску.

Нашы Свіркі месцяцца за паўтара кіламетра ад аграгарадка Параф'янава, што ў Докшыцкім раёне. Там чыгуначны вакзал, базы райспажыўсаюза, мінеральных угнаенняў, школа, садок, бальніца, сельсавет, лясніцтва, крамы. Тут, у нас — вялікі жывёлаводчы комплекс на 400 дойных кароў і такую ж колькасць маладняку. Здавён неяк склалася, што жыхары Свірак працавалі на сельскую гаспадарку. Нехта — у паляводстве, нехта — на трактары, многія — на тым самым комплексе.

Аднак час ішоў. Многія нашы людзі сыходзілі на пенсію, а потым (жыццё ёсць жыццё) і ў іншы свет. Вёска старэла, але жыла, таму што калгас выкупляў пустуючыя дамы, засяляў іх іншымі, прыязджымі жывёлаводамі, даяркамі, пастухамі. Яны ахвотна займалі дамы (дарэчы, з гатовымі гаспадарчымі пабудовамі, з садамі-агародамі) і прыжываліся. Прыжываліся таму, што побач і месца працы, і ўсе аб'екты інфраструктуры, бо Свіркі стаяць на той самай аўтамабільнай дарозе, што з'яўляецца цэнтральнай вуліцай аграгарадка, і туды 6 разоў на дзень ходзяць маршрутныя аўтобусы. Да таго ж у нас водаправод (непадалёк і газаправод з магчымасцю падключэння), асфальтаваная вуліца, у многіх дамах санвузлы, амаль у кожным — стацыянарны тэлефон. Людзі ставяць дэкаратыўныя жалезабетонныя агароджы...

Іншымі словамі — працуй і жыві, гадуй дзяцей. Хто хацеў, мог вазіць іх у дзіцячы садок. А школьнікі нашы наогул не ездзілі, а пехатой хадзілі ў Параф'янава ў школу, бо паўтары вярсты не адлегласць.

Аднак, нягледзячы на ўсё гэта, вёску залічылі ў разрад неперспектыўных. Прынамсі, дамы для жывёлаводаў тут больш не купляюцца і не будуюцца. Даярак на нашу ферму возяць з Параф'янава. У пэўны час яны там павінны сабрацца разам, аўтобусам прыехаць на дойку, заехаць дадому. І так тры разы на дзень.

Адкуль у гаспадаркі грошы на такое вось «таксі», здзіўляюцца многія людзі. І маюць падставы, бо для таго, каб вазіць невялічкую групу людзей, трэба заўсёды мець спраўны аўтобус, сродкі на рамонт і пакупку запчастак, на дарагое паліва, на зарплату кіроўцу...

Аднак гэта яшчэ не вялікія расходы. У аграгарадку тыя даяркі і жывёлаводы жывуць не ў сваіх дамах, а ў службовых. Для таго, каб адзін такі пабудаваць, трэба аддаць (са слоў начальніка райсельгасхарча), не менш за 60000 умоўных адзінак, падвесці водаправод, каналізацыю, лінію электрапередачы, пабудаваць дарогу, адняць ад угоддзяў кавалак ворнай зямлі...

І гэта ў той час, калі па суседстве, у нашай вёсцы, ёсць свабодныя ўчасткі , якія зарастаюць бур'яном. Дык чаму на іх месцы не будаваць тое жыллё?

Ёсць у нас і добрыя, але пустуючыя дамы. Купіць іх можна танна, потым рэканструяваць, падвесці ваду... І не трэба рабіць насып пад новую вуліцу і ўсё іншае.

Дык чаму гэта пэўным чынам не выкарыстоўваецца? Чаму людзей трэба абавязкова сяліць у аграгарадках, а потым вазіць на працу? Чаму яны не могуць жыць побач з тымі фермамі?

Я звяртаўся ў Докшыцкі райвыканкам і ў іншыя органы з просьбай разгледзець пытанне адносна прадастаўлення жывёлаводам добраўпарадкаванага жылля ў вёсцы Свіркі. Мне здавалася, што такі падыход быў бы эканамічна абгрунтаваным. Ды і вёска захавалася б — ёй, згодна з архіўнымі звесткамі, больш за 500 гадоў. Аднак...

Мяне засмуціла, што ва ўсіх адказах не было нават успаміну пра Дырэктыву № 3 «Эканомія і беражлівасць — галоўныя фактары эканамічнай бяспекі краіны», прынятую Прэзідэнтам у 2007 годзе, хоць я аб ёй кожны раз нагадваў. Пісалі, што няма ахвотных жыць у Свірках. А ўсім мясцовым жыхарам (і мне таксама) вядома, што 2 жанчыны-даяркі прасілі пабудаваць жыллё менавіта ў Свірках і паказвалі на пустуючыя ўчасткі. Адной дырэктар ААТ «Райаграсэрвіс» даў нават згоду, а потым... пасяліў у аграгарадку. Другая жанчына працягвае жыць у вёсцы, у калгасным неадрамантаваным доме без ніякіх выгод. Трэцяя — прыязджая даярка — таксама жыла ў Свірках у сястры, пакуль ёй не пабудавалі жытло ў Параф'янаве. Маглі жыць у нас і працаваць на ферме яшчэ дзве даяркі, але іх таксама звезлі.

> **«Яшчэ мне ў адказ пісалі, што будаваць жыллё ў нашай вёсцы нявыгадна. Маўляў, няма кавярні, чыгуначнага вакзала. Адным словам — і смех, і слёзы...**

Цяпер гэтыя жанчыны вяртацца ў вёску, напэўна, не захочуць, таму што пабудавалі ўжо каля хат хляўчукі, лазні — прыжыліся. Але ж, каб было яно, добрае жыллё ў Свірках, навасельцы абавязкова знайшліся б!

Яшчэ мне ў адказ пісалі, што будаваць жыллё ў нашай вёсцы нявыгадна. Маўляў, няма кавярні, чыгуначнага вакзала. Адным словам — і смех, і слёзы...

Я падтрымліваю будаўніцтва дамоў у аграгарадках — гэта, без сумневу, патрэбна, але ж няхай у людзей будзе выбар, няхай яны думаюць, як ім лепш. Тады, магчыма, наладзіцца жыццё не толькі ў вельмі вялікіх вёсках, але і ў меншых, ці нават у прывабных для жыцця малых...

І яшчэ адно пытанне. Колькі існаваў калгас, уздоўж нашай вёскі была грунтовая аб'язная дарога гаспадарчага прызначэння. Па ёй хадзілі трактары з навяснымі агрэгатамі, камбайны, грузавыя аўтамабілі з зернем, бульбай і іншай сельгаспрадукцыяй.

Цяпер гэтую дарогу сталі заворваць, а ўсю тэхніку пусцілі праз вёску. У выніку на асфальтаванай вуліцы з'явіліся шматлікія выбоіны... Летам на дзень Параф'янаўскага сельсавета да нас прыязджаў прадстаўнік райвыканкама, праводзіў сход. Людзі паскардзіліся яму на такія «парадкі», папрасілі выправіць неяк становішча. Пасля гэтага прадстаўнік райёна паведаміў, што восенню зробяць усё, як належыць, а пакуль трэба пачакаць, бо на той узаранай дарозе пасеяна кукуруза. Аднак дачакаліся мы восені — прыехаў трактар і зноў усё ўзараў. Ралля пайшла пад зіму, так што вясной на нашай «вуліцы» зноў, напэўна, нешта пасеюць, і ўся тэхніка будзе ездзіць па вёсцы, каб канчаткова разбіць асфальт.

Вяскоўцы, вядома ж, народ памяркоўны, сцерпяць усё. Але ж навошта тады гэтыя размовы пра чалавечы фактар, пра эканомію і беражлівасць? Мне здаецца, з такім падыходам мы ніколі не будзем жыць дастойна, а толькі зводзіць канцы з канцамі, бо, з эканамічнага пункту погляду, шмат што робіцца зусім не па-гаспадарску.

Магчыма, некаму ўсё апісанае не спадабаецца, але ж я лічу, што ўсе жыхары нашай цудоўнай Беларусі не толькі могуць, але і павінны дапамагаць уладзе наводзіць парадак на месцах.

Уладзіслаў ПІЛЯЧЫНСКІ,

в. Свіркі, Докшыцкі раён.

ЖЫЛЛЁ МАЁ

За офіс — па рэальных тарыфах

Брастаўчанка Вольга Пятроўна — гаспадыня невялічкай кавярні. Спачатку гэтае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства было зарэгістравана ў яе прыватызаванай кватэры. Аднак праз некаторы час давялося перанесці офіс на адрас міні-кавярні.

Чаму? Па яе словах, сумы ў жыроўцы за карыстанне вадой ды і іншымі жыллёва-камунальнымі паслугамі перасягнулі ўсе разумныя межы. На жаль, жанчына, перш чым «прапісаць» прыватнае прадпрыемства па месцы свайго жыхарства, не пацікавілася дакладна, што прадугледжвае заканадаўства па гэтым пытанні.

Справа ў тым, што размяшчэнне офіса прадпрыемства ў жылым памяшканні выклікае і значнае павялічэнне жыллёва-камунальных плацяжоў. Згодна з пастановай Саўміна ад 25 жніўня 1999 года «Аб упарадкаванні разлікаў насельніцтва за карыстанне жылымі памяшканнямі і камунальнымі паслугамі», уласнік кватэры , дзе размешчана прадпрыемства, з даты яго рэгістрацыі плаціць за тэхнічнае абслугоўванне дома, вадазабеспячэнне, падагрэў вады, ацяпленне, электраэнергію, вываз смецця па тарыфах, якія забяспечваюць поўнае пакрыцце затрат па аказанні камунальных паслуг. Прасцей кажучы, сума ў рахунку за жыллё, якое выкарыстоўваецца не па прызначэнні, адразу ўзрастае больш чым у два разы.

Няма падставы думаць так, як палічыла брастаўчанка: калі ў трохпакаёвай кватэры пад офіс выдзелены толькі адзін пакой, то аплата падвоіцца выключна за яго. Палажэнне аб дзяржаўнай рэгістрацыі дазваляе размяшчаць прадпрыемства толькі ў ізаляваных памяшканнях, а ніяк не ў адным з пакояў кватэры. Рэжым работы прадпрыемства пры налічэнні камунальных плацяжоў таксама ўлічваць не будуць. Проста за кожны кубаметр вады, зафіксаваны лічыльнікам, за кожны кілават электраэнергіі і г.д. пастаўшчык адразу прад'явіць рахунак, павялічаны ў два з лішнім раза.

— «Прапісаў» офіс у жылым памяшканні — плаці па і іншым тарыфе, — гаворыць намеснік начальніка цэнтра па налічэнні жыллёва-камунальных плацяжоў Алег Стасевіч. — Пакуль кватэра застаецца месцам рэгістрацыі прадпрыемства, яе ўласнік пакрывае ўсе затраты на аказанне жыллёва-камунальных паслуг. Дзейнае заканадаўства прадугледжвае зніжкі толькі тым, хто выкарыстоўвае жыллё па прамым прызначэнні. Дарэчы, сёння ў брэсцкіх кватэрах зарэгістравана 114 прыватных прадпрыемстваў, і іх уладальнікі плацяць за паслугі ЖКГ цалкам.

Наталля ЖУРАЎЛЕВА.

КАМПЕТЭНТНА

ПРА ФІНАНСЫ І НЮАНСЫ

Наталля КАРПЕНКА

Усе змены, якія датычацца бюджэтнай палітыкі краіны ў цэлым, адбіваюцца і на стане мясцовых бюджэтаў. Пытанне ў тым, якім чынам адбіваюцца — спрыяюць іх фінансаваму напаўненню ці наадварот?.. У гэтым і паспрабавалі разабрацца кіраўнікі пярвічнага ўладнага звяна — старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў — падчас сустрэчы з начальнікам упраўлення мясцовых бюджэтаў Галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Таццянай Астрэйка і адказным сакратаром Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксеем Сцепаненкам.

Мерапрыемства адбывалася ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання — у межах вучэбнай праграмы курсаў павышэння кваліфікацыі. На мой погляд, адведзенага часу — дзвюх акадэмічных гадзін — было відавочна мала для высвятлення ўсіх нюансаў бюджэтнай палітыкі, асабліва той яе часткі, якая датычыцца непасрэдна сельсаветаў. А пытанне, выходзячы з рэалій, злабадзённае. Грошай пярвічнаму ўзроўню ўлады, як заўсёды, не хапае, колькасць патэнцыяльных «кропак» іх укладання ўвесь час павялічваецца... У сітуацыі, калі жаданні і магчымасці не супадаюць, ёсць два шляхі — жыць у крэдыт або жыць па сродках. Відавочна, што сёлета тым кіраўнікам мясцовай улады, якія яшчэ не навучыліся працаваць у межах планавых бюджэтных асігнаванняў, усё ж давядзецца перайсці да рэжыму эканоміі.

Па вялікім рахунку, у «схеме» фарміравання мясцовых бюджэтаў на 2012 год нічога не змянілася. Усе падаткі на прыбытак, атрыманыя ад прадпрыемстваў камунальнай і недзяржаўнай формаў уласнасці, цалкам застануцца ў адпаведных мясцовых бюджэтах (раней жа 50% ад іх паступала ў рэспубліканскі бюджэт) і істотна падмацуюць фінансавую базу тэрыторый.

У даходную частку бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, як і летась, будзе залічвацца падаходны падатак з фізічных асоб — па нарматывах, вызначаных адпаведным раённым Саветам дэпутатаў. Раней, да 2011 года, гэты падатак, сабраны на тэрыторыі сельсавета, у сельсавецкую «казну» не трапляў, а размяркоўваўся паміж раённым і абласным бюджэтамі. Прычым вобласць магла забраць сабе да 20% ад аб'ёму падаходнага падатку, сабранага на тэрыторыі раёна.

Хаця і сёння, заўважыла Таццяна Астрэйка, ступень канцэнтрацыі рэсурсаў на ўзроўні сельсаветаў у рэгіёнах адрозніваецца. Яна залежыць ад «стылю» размеркавання фінансаў, характэрных для Саветаў дэпутатаў таго ці іншага абласнога і базавага ўзроўняў.

— Напрыклад, у Гомельскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцях большая частка расходаў на пярвічным узроўні забяспечваецца за кошт датацый «зверху». А вось у Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях, наадварот, большасць пярвічных бюджэтаў з'яўляецца самадастатковай, — паведаміла Таццяна Астрэйка. — Пра што гэта гаворыць? Пра тое, што ў першых трох абласцях фінансавыя рэсурсы з'яўляюцца ў большай ступені цэнтралізаванымі, і нізавыя бюджэты там менш самастойныя. Сельсаветы гэтых рэгіёнаў маюць стандартную крыніцу фінансавання сваіх расходаў — датацыю.

Але, падкрэсліла фінансіст, датацыя ніколі не сфарміруе сапраўднага гаспадара. А таму бюджэт пярвічнага ўзроўню павінен быць самастойным ці хаця б імкнуцца да самастойнасці, да незалежнасці ад датацый. У апошнім выпадку, перавыканаўшы, напрыклад, план па даходах, сельвыканкам можа нешта дадаткова прафінансаваць на сваёй тэрыторыі.

— Гэта ж нашмат прасцей, чым чакаць дадатковых фінансавых уліванняў з раённага бюджэту. А вы цудоўна ведаеце, як цяжка іх атрымаць, — нагадала прысутным Таццяна Астрэйка. — Таму падчас фарміравання сваіх бюджэтаў на чарговы год рабіце стаўку не на датацыі, а менавіта на адлічэнні ад падаходнага падатку. Чым большы па аб'ёме падаходны падатак будзе сабраны на вашай

тэрыторыі, тым большай будзе частка, што вернецца да вас.

Дарэчы, Таццяна Астрэйка падкрэсліла, што нарматыў адлічэння ад падаходнага падатку ў бюджэт пярвічнага ўзроўню павінен вызначацца раённым Саветам не па прынцыпе «мы так сказалі!», а ў адпаведнасці з унёскам кожнага канкрэтнага сельсавета ў фарміраванне гэтага падатку.

— Старайцеся ўплываць на свае раённыя Саветы «знізу» падчас прыняцця імі рашэнняў, звязаных з фарміраваннем вашых бюджэтаў. Таму што паўплываць на іх «зверху» немагчыма: паводле заканадаўства, органы мясцовага кіравання і самакіравання з'яўляюцца самастойнымі і незалежнымі ў прыняцці рашэнняў, — сказала прадстаўнік Мінфіна.

Паколькі сустрэча праходзіла ў дастатковa свабодным фармаце і не мела ніякага налёту афіцыйнасці, Таццяну Анатольеўну літаральна закідалі пытаннямі. Многіх прысутных, напрыклад, цікавіў «механізм» выкарыстання грашовых сродкаў, якія паступілі ў бюджэт сельсавета ў выніку продажу зямельных участкаў з аўкцыёну. З аднаго боку, Указ № 667 дакладна вызначыў, на якія мэты могуць быць накіраваны гэтыя сродкі: будаўніцтва і рамонт аб'ектаў інфраструктуры, распрацоўка горадабудаўнічай дакументацыі і да т.п. З іншага — такія расходныя паўнамоцтвы для бюджэтаў пярвічнага ўзроўню не прадугледжаны заканадаўствам. Словам, грошы сельвыканкам мае, а патраціць не можа.

Для вырашэння пытання Міністэрства фінансаў прапануе наступную схему. Спачатку сельскі Савет дэпутатаў прымае рашэнне аб перадачы сваіх дадатковых даходаў (якія не мае права патраціць) на больш высокі ўзровень — у раённы бюджэт. А далей раённы Савет дэпутатаў накіроўвае гэтыя ж сродкі — мэтавым прызначэннем — на будаўніцтва аб'ектаў інфраструктуры на той тэрыторыі, дзе яны былі зароблены.

— Толькі не забудзьце прапісаць у сваім рашэнні мэту, на якую збіраецеся патраціць грошы, — дадала Таццяна Астрэйка.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Кожны двор і кожны дом

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Трэба разабрацца і не толькі пакараць вінаватых, але і папярэдзіць пажары ў далейшым. Працуюць у такім кірунку назіральныя камісіі з удзелам дэпутатаў, абследуюць жыллё на прадмет супрацьпажарнай бяспекі. У якім стане электрычная праводка, печка? Ці выкарыстоўваюцца электраабагравальныя прыборы? Ці ёсць у доме аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі? Якая дапамога патрэбна адзінокай бабулі, інваліду?

— Да наступнага ацяпляльнага сезона неабходна абследаваць кожны без выключэння вясковы дом, — гаворыць Уладзімір Марыновіч. — І тым, каму неабходна, дапамагчы.

Вядома, і ў горадзе, і ў вёсцы, дэпутатам хапае клопатаў. У сельскай мясцовасці Саветам дапамагаюць старасты, ці старэйшыны, як іх яшчэ называюць. Канец зімы — пачатак вясны якраз час іх перавыбрання. У раёне больш за 130 старэйшын. Уладзімір Марыновіч так ставіцца да гэтага пытання: калі ў вёсцы хаця б двароў дзесяць ёсць, нават з дачнікамі, трэба выбіраць старэйшыну. А гэта, зразумела, людзі актыўныя, неабыякавыя, хаця часцей за ўсё сталыя — пенсіянеры. Яны — тое моцнае звяно, якое звязвае вяскоўцаў і старшыню Савета.

— Ніхто лепш, чым старэйшына, не ведае, што адбываецца ў яго вёсцы, — працягвае Уладзімір Марыновіч. — Ён і сельскі сход дапаможа арганізаваць, і пра кожную праблему ў сваёй вёсцы хутчэй за іншых даведаецца. Засталася бабуля адна — старэйшына падыдзе, спытае, ці не трэба чаго. Старшыня сельскага Савета, можа, і не паспее ў кожны дом у кожнай вёсцы зайсці, а старэйшына ўсіх ведае, нікога не абміне. І ў сем'і, дзе дарослыя п'юць, яны таксама ідуць... Гэта ў нейкай ступені «хуткая дапамога» для вяскоўцаў. З самых лепшых у раёне магу назваць Леаніда Паўлавіча Рамановіча з вёскі Данілавічы, Валянціну Уладзіміраўну Веркавіч з Крыштафова, Валянціну Лаўрэнцьеўну Стыпуцька з Кавярлянаў, Тамару Антонаўну Моўчан з Путчына.

Летась у Дзяржынскім раёне быў праведзены семінар са старэйшынамі, дзе, акрамя вуснай інфармацыі, яны атрымалі папкі з дакументамі, якія, будзем спадзявацца, сапраўды дапамогуць гэтым людзям у іх грамадскай працы. Там ёсць палажэнне аб старэйшыне населенага пункта, тлумачэнні парадку і ўмоў крэдытавання асабістых падсобных гаспадарак, а таксама правілы добраўпарадкавання і ўтрымання тэрыторый горада Дзяржынска і населеных пунктаў Дзяржынскага раёна. Ёсць у старэйшын і тэлефонныя нумары шэрагу раённых службаў і службовых асоб — ад раённага Савета дэпутатаў да раённага вузла паштовай сувязі. А калі нехта з вяскоўцаў захоча да кіраўніка сам падысці — ці ў Дзяржынск пад'ехаць, ці дачакацца выязной прыёмнай або дня інфармавання ў сваім сельсавеце — старэйшына падкажа, калі гэта лепш зрабіць.

АД ПІЯНЕРВАЖАТАЙ — ДА СТАРЭЙШЫНЫ

Валянціна Барысенка (справа) са сваімі аднавяскоўцамі.

— Якую б пасаду чалавек ні займаў — гэта асоба, і з ёю трэба лічыцца.

Вераніка Мікалаеўна Барысенка, старэйшына вёскі Чырвонабярэжжа, дзеліцца сваімі думкамі наконт «кіравання людзьмі». У самой жыццёвы вопыт багаты, і набывала яна яго на роднай зямлі — тут, у Лельчыцкім раёне. Дзяцінства прайшло непадалёк ад жывапіснай рэчкі Убарць, за 200 кіламетраў ад Гомеля. Праўда, тады вёска называлася Злодзін:

— Перайменавалі толькі ў ліпені 1964 года. Легенду расказваюць старыя людзі: ехаў колісь багаты чалавек са сваёю світаю. Спыніліся яны на Убарці. Тут багацей угледзеў, што нешта ўкралі з яго пажыткаў. Вось ён і падняў лямант, закрычаў «злодзін!» замест «злодзей». Хоць афіцыйна паселішча вядома з XVIII стагоддзя. Тады яно ўваходзіла ў склад Мазырскага павета Мінскага ваяводства.

Алена Сярдзюк, старшыня Ударненскага сельскага Савета, у які ўваходзіць вёска Чырвонабярэжжа, расказвае, што заўважыла будучую памочніцу па самакіраванні на адным з вясковых сходаў — вельмі ж актыўнай яна здалася, падымала сапраўдныя праблемы, неабыякава ставілася да ўсяго, што навокал. Гэта і не дзіўна. Вераніка Мікалаеўна была і піянерважатай, і сакратаром партыйнай арганізацыі, і прафсаюзную ўзначальвала ў мясцовай школе. На месцы і цяпер, пасля выхаду на пенсію, сядзець не можа, і правілы, якія для сябе сфармулявала, у жыццё ўвасабляе паслядоўна:

— Нельга абяцаць тое, што не зможаш зрабіць. А калі ўжо не атрымліваецца, трэба папрасіць выбачэння і растлумачыць, калі наабяцанае будзе зроблена. А яшчэ трэба мець цярпенне, вытрымку і настойлівасць у стасунках з людзьмі. Я паставіла перад сабой мэту: зрабіць наш населены пункт чыстым, прыгожым, утульным і камфортным для пражывання чалавека. І гэтага можна дабіцца сваёй працай і за кошт сваіх асабістых фінансавых укладанняў.

Вераніку Мікалаеўну Барысенку старэйшынай абралі ў 2007 годзе. І з таго часу справы закіпелі, бо насамрэч працы хапала: звалак са смеццем вакол вёскі было безліч, пустыя дамы зарасталі хмызняком. Сёння гэтая непрыгожая старонка мясцовай гісторыі ўжо перагорнута.

— Пачалі збіраць сродкі на агароджу для могілак і фарбу для яе. Спачатку проста імкнуліся пераканаць людзей, растлумачыць. А потым прыцягнулі да справы гурток самадзейнасці з нашага клуба. Дык яго ўдзельнікі на Каляды пайшлі па дварах, а ўсе зборы аддалі на афарбоўку агароджы.

«Ну і навошта ёй гэта трэба?» — не могуць зразумець многія. Ёй сапраўды трэба значна больш, чым іншым. І яна не проста гаворку вядзе, а ўласным прыкладам паказвае, што і як рабіць. Напрыклад, калісьці вясной пасадзіла кветкі ля свайго дома на вуліцы. Падцягнуліся і іншыя гаспадыні, і стала гэта на вёсцы традыцыяй. Цяпер клопат Веранікі Мікалаеўны — стварэнне дзіцячай пляцоўкі на месцы знесенага безгаспадарнага дома. Да справы падключыла і аднавяскоўцаў. Яны расчысцілі ўвосень пляцоўку, агароджу паставілі, нават пафарбаваць паспелі да зімы. Цяпер вясны чакаюць, каб на гэтым месцы паставіць розныя прылады для гульняў.

— За зіму кожная сям'я павінна нешта зрабіць для гэтай пляцоўкі: хто пясочніцу, хто турнік, хто арэлі, хто тэнісны стол, хто «змейку», хто столік для шашак-шахмат і гэтак далей, — дзеліцца сваімі задумамі Вераніка Мікалаеўна. — Гэта будзе горад казак — пляцоўка для дзяцей рознага ўзросту. Дарэчы, да нас з горада вельмі шмат дзяцей прыязджае летам.

Відаць, і свае чацвёра ўнукаў парадуюцца, калі бабуліна мара будзе ўвасоблена ў жыццё. Дарэчы, настаўніца матэматыкі і фізікі, педагог з 41-гадовым стажам, выхавала траіх сыноў. Яны зараз жывуць і працуюць у розных гарадах Беларусі, але ж матулю не забываюць, прыязджаюць і дапамагаюць ёй. Перайздзяць да іх жыць яна не збіраецца.

— Прывыкла да тутэйшых людзей, — кажа коратка.

Паралельна Вераніка Барысенка спраўляецца і з грамадскай работай, і з уласнай гаспадаркай. Трымае не толькі карову, але і парсюкоў, і курэй. Ды і па лясныя дары на веласіпедзе абавязкова выязджае летам-восенню. Як жа ў Лельчыцкім краі ды без чарніц ці журавін? 333 жыхары жыве ў вёсцы, пераважна пенсіянеры. І да кожнага Вераніка Мікалаеўна знайшла падыход.

— Варушу сваіх аднавяскоўцаў, каб суменсымі намаганнямі зрабіць Чырвонабярэжжа прыгожым. Калі чалавек для агульных патрэб штосьці сваімі рукамі робіць, ён душой вырастае. Мы са старшынёй сельскага Савета працуем як адно цэлае. Але проста падпарадкоўвацца я не ўмею. Я магу і паспрачацца, але ўрэшце мы выходзім да адной думкі. У нас дзелавое супрацоўніцтва.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ПРА ФІНАНСЫ І НЮАНСЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Увогуле, паводле меркаванняў спецыялістаў, бюджэт 2012 года можна назваць бюджэтам стабілізацыі.

— Здзяйсняць капітальныя расходы сёлета будзе вельмі праблематычна. Але жорсткія меры бюджэтна-крэдытнай палітыкі накіраваны якраз на тое, каб мы хутчэй выйшлі на стабільнае эканамічнае развіццё, — сказала фінансіст. — Для дасягнення гэтай мэты кансалідаваны бюджэт 2012 года сфарміраваны без дэфіцыту, ён з'яўляецца збалансаваным па даходах і расходах. Адпаведна, не павінны быць дэфіцытнымі і кансалідаваныя бюджэты абласцей. А вось бюджэты пярвічнага ўзроўню быць дэфіцытнымі могуць, але іх дэфіцыт павінен кампенсавацца ўнутры вобласці, за кошт яе грашовых рэсурсаў.

> **Хочаце касіць — касіце! Толькі потым не абурайцеся, што вас не ўспрымаюць як уладу...**

Таццяна Астрэйка параіла пярвічнаму звяну ўлады здзяйсняць свае расходы выключна ў межах планавых бюджэтных асігнаванняў і не дапускаць крэдыторскай запазычанасці, не забяспечанай такімі асігнаваннямі.

Таксама прысутныя пацікавіліся, чаму сельвыканкамам даводзяць заданні па зборы металалому і макулатуры і нават «планы» па самаабкладананні?.. Адзін з удзельнікаў сустрэчы задаў пытанне, якое, можна сказаць, стала традыцыйным: чаму сельвыканкамам забараняюць набываць імпартныя касілкі? Як, маўляў, у такім выпадку займацца добраўпарадкаваннем?

— Па-першае, цяпер выпускаюць і аналагічныя беларускія касілкі... Калі ж вы ўжо набылі імпартную, ніхто не забараняе купляць расходныя матэрыялы для яе абслугоўвання, — адказала Таццяна Астрэйка. — Але ж задачы па добраўпарадкаванні павінны вырашацца сіламі спецыяльна навучаных людзей, у якіх ёсць свая тэхніка. Стварайце КУПы, больш актыўна прыцягвайце грамадскасць і мясцовыя арганізацыі да навядзення парадку на сваіх падворках і тэрыторыях. Тады вам і касілка не спатрэбіцца.

— На жаль, органы мясцовага кіравання і самакіраванне пярвічнага ўзроўню часам не разумеюць, каго прадстаўляюць, — падвёў рысу пад усім сказаным Аляксей Сцепаненка. — Дзяржава мэтанакіравана, крок за крокам, робіць пэўныя захады, каб вызваліць сельскія Саветы ад неўласцівых ім гаспадарчых функцый. Каб яны не займаліся рамонтам будынкаў, водаправодаў, дарог, абкосам тэрыторыі, могілак і г.д. Функцыя ўлады — спытваць са службаў, якія непасрэдна адказваюць за гэтыя пытанні! А вы зноў спрабуеце ўсё паставіць з ног на галаву: маўляў, дайце нам касілкі, мы самі будзем касіць. У такім выпадку хочацца сказаць: ну дык і касіце! Толькі потым не абурайцеся, што вас не ўспрымаюць як уладу...

Зразумела, што звычку, якая фарміравалася дзесяцігоддзямі і не ад добрага жыцця, за кароткі час не пераадолееш. Але рабіць гэта неабходна, дадаў Аляксей Сцепаненка. Трэба навучыцца паважаць сябе як уладу — для таго, каб цябе паважалі іншыя.

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Расходы по подготовке документов	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Цна, участок № 6, 623287609601000026	0,2491	2 726 937	14 946 000	1 494 600
2	д. Цна, участок № 7, 623287609601000027	0,2434	2 726 937	14 604 000	1 460 400
3	д. Морозовка, участок № 2, 623287605601000007	0,2500	2 503 030	8 750 000	875 000
4	д. Молоди, участок № 18, 623287605101000104	0,1598	2 768 830	9 588 000	958 800
5	д. Молоди, участок № 20, 623287605101000101	0,1108	2 768 830	6 648 000	664 800
6	д. Мостище, участок № 41, 623287606101000158	0,2250	2 768 852	12 375 000	1 237 500

Задаток перечисляется на р/с 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **9 апреля 2012 года в 11.00** по адресу: Минская обл., Логойский р-н, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 11.00 04 апреля 2012 года.**

Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, 8 (029) 107 16 17.
Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by

НЕВЫЯЗНЫЯ... КІРОЎЦЫ

За мінулы год з парушальнікаў правілаў дарожнага руху ўдалося своечасова спагнаць толькі каля 75 працэнтаў штрафаў па адміністрацыйных матэрыялах. Таму прымаюцца захады, каб не было ніякай адтэрміноўкі.

У гэтым некаторыя кіроўцы ўжо пераканаліся ў пунктах пропуску на дзяржаўнай мяжы. У людзей, якія быццам не маюць грошай на штраф за парушэнні на дарогах, тым не менш знаходзяцца сродкі на паездку ў Польшчу ці Літву. Аднак... ДАІ вызначае так званых сістэмных парушальнікаў, накіроўвае спісы такіх «рэцыдывістаў» у суды, якія аб'яўляюць гэтых кіроўцаў невыязнымі. Пакуль не заплацяць па прад'яўленых рахунках за свае «грахі». Таму, зразумела, лепш своечасова разлічыцца.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ОАО «Веста», г. Витебск, сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров,
которое состоится 29 марта 2012 года в 15 часов в актовом зале Витебского учебного центра профсоюзов по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 8 а

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах деятельности акционерного общества за 2011 год.
2. Об утверждении годового баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Веста» за 2011 год.
3. Отчет Наблюдательного совета.
4. Отчет ревизионной комиссии.
5. Утверждение распределения прибыли общества за 2011 год.
6. Определение направлений использования прибыли общества в 2012 году.
7. Об утверждении Положения об использовании прибыли ОАО «Веста».
8. О приобретении открытым акционерным обществом «Веста» акций, выпущенных открытым акционерным обществом «Веста».
9. О выплате дивидендов акционерам ОАО «Веста» по итогам работы за 2011 год.
10. Выборы Наблюдательного совета общества.
11. Выборы ревизионной комиссии общества.
12. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета.
13. О безвозмездной передаче имущества.
14. Об оказании спонсорской помощи.

УНП 300200651

«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, извещает своих акционеров, что 19 марта 2012 года в 10.00 состоится очередное Общее Собрание акционеров банка

Собрание состоится в г. Минске по адресу: пр. Победителей, 59, бизнес-центр гостиницы «Виктория».

Орган, созывающий собрание акционеров, – Наблюдательный Совет «Приорбанк» ОАО.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, за 5 дней до начала Собрания в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Регистрация участников будет осуществляться с 9.00 до 9.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия, путем внесения сведений об участнике в автоматизированную информационную систему регистрации участников Собрания и составления списка лиц, зарегистрировавшихся для участия в Собрании, содержащего подписи этих лиц.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

Повестка дня:

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2011 год.
2. Отчет Правления о работе банка за 2011 год.
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2011 год. Утверждение годового отчета за 2011 год: баланс банка, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала и отчет о движении денежных средств; распределение прибыли за 2011 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
4. Установление размера дивидендов и срока их выплаты.
5. Определение размера вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного Совета, Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.
6. Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО.
7. Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО.

Наблюдательный Совет, Правление «Приорбанк» ОАО.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 28.08.2008 года. УНП 100220190.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

НАВОШТА ТАКІЯ НАВАЦЫІ?

У 2015 годзе энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту павінна быць знікжана на 50 працэнтаў да ўзроўню 2005-га. Ужо сёлета неабходна павялічыць долю мясцовых відаў энергетычных рэсурсаў у балансе кацельна-пячнога паліва рэспублікі. На гэтыя мэты расходуюцца вялізныя сродкі, прычым не толькі канкрэтных прадпрыемстваў і арганізацый, але і з бюджэту. А значыць, падаткаплацельшчыкі (у дадзеным выпадку чытачы «Звязды») павінны ведаць, наколькі эфектыўна яны выкарыстоўваюцца. Вось некаторыя факты і меркаванні.

Было гладка на паперы

Што будзе, якая будзе бяда, калі рухавік аўтамабіля замест прызначанага для яго бензіну раптам атрымае салярку? Альбо наадварот? Такое нават цяжка ўявіць, бо не вораг жа кіроўца самому сабе. Аднак нешта падобнае здарылася падчас рэканструкцыі кацельні брыкетнага цэха ў вёсцы Верцялішкі Гродзенскага раёна.

Хоць задумка быццам і адпавядала патрабаванням часу па выкарыстанні мясцовага паліва. Сапраўды, калі ўласнага газу краіна не мае, хіба ж не лагічна торфапрадпрыемству задзейнічаць у сваёй кацельні менавіта торф? Што і было падмацавана адпаведным пунктам абласной праграмы на 2008 год: рэканструкцыя кацельні з заменай паравога катла на кацёл для спальвання торфу. Вызначылі крыніцы фінансавання (інавацыйны фонд, уласныя сродкі), тэрмін уводу аб'екта ў эксплуатацыю (верасень 2008 года). Ды і тэрмін акупнасці гэтага праекта пралічвалі, здавалася б, вельмі скрупулёзна: роўна дзесяць гадоў плюс яшчэ адзін месяц.

І што ў выніку? Згодна з інфармацыяй Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, на закупку і мантаж абсталявання атрымана і зрасходавана 2,9 мільярда рублёў з інавацыйнага фонду Міністэрства энергетыкі. Аднак і па сёння гэты аб'ект у эксплуатацыю не ўведзены. Па той прычыне, што кацёл, які трапіў у Верцялішкі, прызначаны для работы на... прыродным газе альбо мазуце. Але ніяк не на торфе. Што, дарэчы, пацвярджаецца пісьмом вытворцы і пастаўшчыком катла.

Вось табе і на... Што за гэтым? Некампетэнтнасць, галавацяпства службовых асоб прадпрыемства, больш высокіх інстанцый?

І дзе праектная магутнасць?

У энергазберагальную праграму вобласці на 2010 год уключылі мераприемства на Дворацкім ільнозаводзе. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і ўласных грошай прадпрыемства набыла турбагенератарную ўстаноўку беларускай вытворчасці (агульным коштам 1,1 мільярда рублёў) для выпрацоўкі электраэнергіі. Пры гэтым, як і ў Верцялішках, спадзяваліся на мясцовае паліва. Але ...

На заводзе двойчы праводзілі комплекснае апрабаванне, але аказалася, што новае абсталяванне не можа выйсці на праектную магутнасць, таму што лінія па вытворчасці льновалакна не ў стане забяспечыць дастатковую колькасць паліва (ільнокастрыцы) для нармальнага рэжыму катлоў.

Разлічвалі на кастрыцу (адходы вытворчасці ААТ «Карэлічы-Лён») і ў кацельні ў Карэлічах. У 2008 годзе па абласной праграме энергазберажэння накіравалі амаль у 127 мільёнаў рублёў на завяршэнне ўстаноўкі катла з механізаванай палівападачай. Толькі ў лютым 2010-га кацёл быў пастаўлены, аднак кастрыца выкарыстоўвалася рэдка, а летась на ёй увогуле не працавалі. З-за абмежаванасці паставак і павышэння кошту кастрыцы катлы былі пераведзены на... дровы. Прычым не ў аўтаматычным рэжыме палівападачы, а ў ручным. Такім чынам, грошы на энергазберажэнне затрацілі, а пра такую «дробязь», як наяўнасць паліўных рэсурсаў, толкам не падумалі. Цяпер, мусіць, зноў не абысціся без фінансавых уліванняў. Карэліцкае РУП ЖКГ ужо звярнулася на УП «Гроднаэнергазберажэнне» з просьбай аб распрацоўцы канструктыўнага рашэння: аб пераводзе катлоў на дранку.

Вярніце грошы — мы ўсё даруем!

Безумоўна, укараненне новага абсталявання — гэта заўсёды пэўная рызыка, тут не выключаны і пралікі, і памылкі. Напрыклад, Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альберцін» толькі пасля працяглага судовага разбору вярнуў пастаўшчыку энергаўстаноўку, якую так і не ўдалося давесці да пашпартнай магутнасці па атрыманні электрычнай і цеплавой энергіі. Было ўстаноўлена, што прычына — у схаваных дэфектах абсталявання, а таму далейшая яго эксплуатацыя немагчымая. Дагавор прадпрыемства з РУП «Белінвестэнергазберажэнне» быў скасаваны, а на рахунак завода нядаўна паступіла 210 мільёнаў рублёў з сумы, якая была затрачана на гэты няўдалы праект (812 млн рублёў, у тым ліку 495 млн руб. з інавацыйнага фонду Мінэнерга). А да верасня гэтага года павінны вярнуць астатняе.

Але гэта, як сведчаць вынікі праверак выкарыстання «энергазберагальных» сродкаў, рэдкі выпадак, калі былі прыняты дзейсныя захады. Таму Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці прапануе на заканадаўчым узроўні вызначыць адказнасць за неэфектыўнае выкарыстанне бюджэтных грошай на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КІТАЙ, ШВЕЙЦАРЫЯ, МІНШЧЫНА

Сярод найбольш значных інвестыцыйных праектаў, што будуць рэалізаваныя на Міншчыне, — кітайска-беларускі індустрыяльны парк, а таксама сумесныя вытворчасці са швейцарцамі.

Што датычыцца індустрыяльнага парку, то, як вядома, яго будаўніцтва плануецца ў Смалявіцкім раёне. І гэта выклікае занепакоенасць у пэўнай часткі дачнікаў і мясцовага насельніцтва. Губернатар Мінскай вобласці Барыс Батура ўжо неаднойчы выказваўся наконт таго, што інтарэсы людзей ніякім чынам не будуць закрануты з-за гэтага будаўніцтва. На нядаўняй прэс-канферэнцыі ён яшчэ раз выказаўся на гэтую тэму: « Калі б хтосьці з тых, хто выступае супраць парку, пабываў у Кітаі і такі парк убачыў, ён клапаціўся б пра тое, каб падобны парк з'явіўся ў Мінскай вобласці. Усё гэта будзе створана на свабоднай зямлі і ніякім чынам не закране інтарэсы грамадзян».

Акрамя таго, сярод інвестыцыйных праектаў, якія будуць рэалізаваны ў вобласці — вытворчасць легкавых аўтамабіляў, таксама сумесна з кітайскім бокам. А яшчэ сумесная са швейцарцамі вытворчасць электрычак, трамваяў і тралейбусаў, стварэнне прадпрыемства па выпуску штучных каленных суставаў.

Марына ХІДДЖАЗ.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаянай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 30.015. Нумар падпісаны ў 19.30 6 сакавіка 2012 года.

■ Абітурыент—2012

ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ СТАРТУЕ З ПРАФЕСІЙНА-ПСІХАЛАГІЧНАЙ ГУТАРКІ

5 сакавіка ў ВНУ распачалася рэгістрацыя абітурыентаў для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі

Шчыра кажучы, многія па сённяшні дзень не разумеюць сэнсу гэтай даволі працаёмкай і нятаннай працэдуры, паколькі колькасць тых, хто не пераадольвае папярэдні бар'ер, складае кожны год менш як 1 працэнт ад агульнай колькасці ўдзельнікаў гутаркі. Між іншым, да ўдзелу ў гутарцы, акрамя работнікаў ВНУ, прыцягваецца шмат спецыялістаў звонку: гэта прафесійныя псіхолагі і спецыялісты па рабоце з моладдзю, работнікі міністэрстваў, Мытнага камітэта, Генеральнай пракуратуры, Вярхоўнага і Вышэйшага Гаспадарчага судоў, рэдакцый вядучых сродкаў масавай інфармацыі. Магчыма, апуха не варта кажуха? Тым больш што год ад года колькасць «выпадковых» абітурыентаў, якім было адмоўлена ў рэкамендацыі, змяншаецца.

ПЕРАЛІК УСТАНОЎ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ — МЕСЦАЎ ПРАВЯДЗЕННЯ ПРАФЕСІЙНА-ПСІХАЛАГІЧНАЙ ГУТАРКІ Ў 2012 ГОДЗЕ З ПАЗНАЧЭННЕМ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯЎ І ГРУП СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯЎ, ПА ЯКІХ БУДЗЕ АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЦА ПРАФЕСІЙНА-ПСІХАЛАГІЧНАЯ ГУТАРКА

Спецыяльнасць (група спецыяльнасцяў)	ВНУ — месцы правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі
Дзяржаўнае кіраванне, дзяржаўнае кіраванне і эканоміка:	Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. Шамякіна Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Пушкіна Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны
Міжнародныя адносіны, Міжнароднае права:	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны ўніверсітэт «МИТСО» Прыватная ўстанова адукацыі «БІП —Інстытут правазнаўства»
Дзяржаўнае кіраванне і права, правазнаўства, эканамічнае права:	Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Беларусі дзяржаўны ўніверсітэт Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Куляшова Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Пушкіна Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.Машэрава Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы Беларуская дзяржаўная ордэнаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Міжнародны ўніверсітэт «МИТСО» «Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут» Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва Прыватная ўстанова адукацыі «БІП — Інстытут правазнаўства» Прыватная ўстанова «Мінскі інстытут кіравання» Прыватная ўстанова «Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва»
Журналістыка, міжнародная журналістыка:	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Куляшова Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Пушкіна Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.Машэрава Прыватная ўстанова «Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва»
Мытная справа:	Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту

АДНАК у галоўным адукацыйным ведамстве краіны ўпэўненыя ў карыснасці прафесійна-псіхалагічнай гутаркі, якая дазваляе абітурыентам загадзя ацаніць правільнасць выбару будучай прафесіі. Асноўная мэта, якая стаіць перад членамі камісіі, — выявіць у абітурыента матывацыю і ацаніць яго асабовыя якасці, тым больш калі размова ідзе пра будучага прафесійнага дзяржаўнага кіраўніка. На гутарцы ад абітурыентаў патрабуецца прадэманстраваць сваю эрудыцыю, разуменне грамадска-палітычнага жыцця краіны і эканамічнай сітуацыі, працэсаў, што адбываюцца ў Беларусі і за яе межамі. Адназначна вітаюцца камунікатыўная кампетэнтнасць абітурыента, яго ўменне абгрунтоўваць сваю пазіцыю, падмацоўваць прыкладамі, паўната і лагічнасць адказаў, карэктнасць і правільнасць мовы. Бяруцца пад увагу таксама лідарскія і арганізатарскія здольнасці маладых людзей, іх уменне выходзіць з нестандартных сітуацый, гатоўнасць працаваць у камандзе.

Папярэдні прафадбор праводзіцца пры паступленні на 10 спецыяльнасцяў, дзе да будучых спецыялістаў дзяржавай прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні. У гэты пералік уваходзяць спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне», «Дзяржаўнае кіраванне і права», «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «Міжнародныя адносіны», «Міжнароднае права», «Правазнаўства», «Эканамічнае права», «Журналістыка», «Міжнародная журналістыка» і «Мытная справа». Варта мець на ўвазе, што праз папярэдні прафадбор павінны прайсці ўсе, хто плануе паступаць на дзённую, вячэрнюю, завочную і дыстанцыйную формы навучання, на паралельнае навучанне, навучанне ў скарочаныя тэрміны, на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на ўмовах аплаты фізічнымі і юрыдычным асобамі. Гэта тычыцца і абітурыентаў прыватных ВНУ.

Ад праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі вызваляюцца толькі замежныя грамадзяне, якія плануюць паступаць у беларускія ВНУ, але пражываюць за межамі краіны. Аднак замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі, павінны такую гутарку прайсці. Абітурыенты маюць права прайсці гутарку па кожнай групе спецыяльнасцяў, напрыклад, для паступлення на «Журналістыку» і «Міжнародныя адносіны». Для гэтага трэба асобна зарэгістравацца на кожную групу спецыяльнасцяў. Аднак рэгістравацца на адну і тую ж спецыяльнасць (групу спецыяльнасцяў) у розных ВНУ катэгарычна забараняецца.

Па выніках гутаркі камісіяй прымаецца рашэнне: рэкамендаваць або не рэкамендаваць кандыдата для ўдзелу ў конкурсе па абранай спецыяльнасці (групе спецыяльнасцяў). Рашэнне прымаецца простай большасцю галасоў членаў камісіі. Дакументам аб выніках праходжання гутаркі з'яўляецца рэкамендацыя для

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ўдзелу ў конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі. Рэкамендацыя выдаецца кандыдату ў дзень праходжання гутаркі і дзейнічае да канца бягучага каляндарнага года. Такім чынам, абітурыенты, якім летась не пашчасціла пры паступленні ў ВНУ, але якія паспяхова прайшлі папярэдні прафадбор, павінны будуць прайсці яго зноў.

Рэгістрацыя будзе доўжыцца па 31 сакавіка ўключна. Заява для ўдзелу ў прафесійна-псіхалагічнай гутарцы можа быць пададзена грамадзянінам асабіста ці быць накіравана па пошце. У першым выпадку будучы абітурыент асабіста паказвае пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу. А пры накіраванні па пошце да заявы прыкладаецца копія пашпарта ці іншага дакумента, які сведчыць асобу. Адказнасць за правільнасць і праўдзівасць звестак заявы ўскладаецца на грамадзяніна. У Міністэрстве адукацыі папярэджваюць, што заявы, якія паступяць пасля 31 сакавіка, разглядацца не будуць.

Трэба дадаць, што рэгістравацца і праходзіць гутарку можна ў любой ВНУ, указанай у пераліку, незалежна ад таго, куды будзе паступаць абітурыент. Прафесійна-псіхалагічная гутарка пройдзе з 5 па 30 красавіка ў адпаведнасці з графікамі, зацверджанымі ВНУ.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:
Вынікі прафесійна-псіхалагічнай гутаркі ў БДУ:
у 2009 годзе гутарку прайшоў 3861 абітурыент, з іх 23 чалавекі рэкамендацыю камісіі не атрымалі;
у 2010 годзе — 3093 абітурыенты, з іх не прайшлі прафадбор 6 чалавек;
у 2011 годзе — 2808 абітурыентаў, прафадбор не здолелі прайсці 12 чалавек.
У гэтым годзе для правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі ў Белдзяржуніверсітэце былі сфарміраваны 32 камісіі.

ДАЖЫНКІ-2013 ПРОЙДУЦЬ У ГОМЕЛІ

Пра гэта паведаміў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. Кіраўнік вобласці адзначыў, што гэтае пытанне абмяркоўвалася на апошняй яго сустрэчы з Прэзідэнтам краіны, і Аляксандр Лукашэнка падтрымаў яго просьбу аб пераносе фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2013» з Рагачова, як планавалася раней, у абласны цэнтр.

— Горад Гомель сёння мае і самую вялікую тэрыторыю, і самую вялікую колькасць насельніцтва сярод абласных цэнтраў. Але ж магчымасці бюджэту вобласці абмежаваныя, каб па-сапраўднаму аднавіць аблічча горада над Сожам. Таму ўзгоднена пытанне: для правядзення наступнага свята «Дажынкі» падрыхтаваць Гомельскі раён і горад Гомель. Ну а Рагачоў — гэта невялікі рэгіён, і яго мы адбудуем сваімі сіламі.

Акрамя таго, на сустрэчы з журналістамі Уладзімір Дворнік расказаў аб праграме развіцця Прыпяцкага рэгіёна, у тым ліку асваення Петрыкаўскага радовішча калійных соляў:

— Жыццёвы ўзровень людзей залежыць ад аб'ёму і эфектыўнасці вытворчасці. Для таго, каб годна жыць, трэба думаць пра тое, як іх павялічваць, у тым ліку і экспарт. Хуткае асваенне Петрыкаўскага радовішча калійных соляў дазволіць павялічыць аб'ём прамысловай вытворчасці ў рэгіёне, забяспечыць паступленні ў бюджэт і гэтак далей. Гэты рэсурс пакуль да канца не разведаны. Але ўжо сёння зразумела, што па якасці ён значна пераўзыходзіць Салігорскія радовішчы.

Не меньш значныя змены чакаюць і самы паўднёвы край Гомельскай вобласці, самы буйны яе раён — Лельчыцкі, дзе 70% тэрыторый займаюць лясы. Уладзімір Дворнік расказаў, што сёння там вельмі актыўна развіваецца прыватны бізнэс:

— Больш за палову бюджэту фарміруецца за кошт прыватнага бізнэсу. Акрамя таго, Лельчыцкі рэгіён багаты сваімі выкапнямі, якія сёння не асвоены на належным узроўні. Буры вугаль, сапрапелі, торф, лясныя ўгоддзі. Яны знаходзяцца на самым краі вобласці, куды не пракладзена чыгунка. Таму пры перавозцы аўтатранспартам рэзка павялічваецца сабекошт прадукцыі. Кошт будаўніцтва чыгункі складзе каля Br1,8-1,9 трлн. Думаю, гэта тэма знойдзе працяг. Кіраўнік дзяржавы паабяцаў вярнуцца да яе ў красавіку, калі ён будзе наведваць чарнобыльскія рэгіёны. Што тычыцца прыцягнення замежных інвестыцый у эканоміку Гомельшчыны, па выніках 2011 года яны склалі $1,3 млрд. Прамыя замежныя інвестыцыі — больш за $210 млн — сталі гістарычным максімумам для Гомельскай вобласці.

— Інвестыцыі — гэта жыццё для нашага рэгіёна, — падкрэсліў Уладзімір Дворнік. — Гэта не толькі аб'ёмы вытворчасці, але, урэшце, дабрабыт людзей.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

■ Ліст у нумар

«ДЫК ЧАМУ Ж НЕ ЗАСПЯВАЦЬ ПА-СВОЙМУ?»

Я жыву ў вёсцы, у глыбінцы Берасцейшчыны. Люблю мастацтва. Крыху лепш разбіраюся ў літаратуры (філолаг па адукацыі). У музыцы і жывапісе — на ўзроўні аматара: у маладосці збірала рэпрадукцыі карцін (пераважна з часопіса «Огонек»), плясцінкі з любімымі творамі. У больш сталым узросце часу на гэта ўжо не было: тыповы лёс вясковага настаўніка, а гэта значыць — лектара таварыства «Веды», удзельніка мастацкай самадзейнасці і ўсіх «добраахвотных» нядзельнікаў-суботнікаў, «вырошчвальніка» дзялкі буракоў у калгасе... У дадатак — свая сям'я і свая гаспадарка, без якой ні тады, ні цяпер, відаць, нельга пражыць у вёсцы.

Няцяжка ўявіць, як хутка ад гэтага звужаецца кругагляд. Што не віна настаўніка, а хутчэй бяда. Выстойвалі — адзінкі!..

Дык вось пра «ЕўраФэсты» ранейшых гадоў і пра «Еўрабачанне» гэтага.

Першае. Як мне здаецца, мы залішне «б'ём» на знешнія эфекты. Збіраемся ўразіць Еўропу звышэкстравагантнымі прычоскамі і строямі. Для той жа Алешкі варта было б прадугледзець пажоў, якія падчас выступлення насілі б за ёй «хвост» сукенкі. Не зусім зразумелыя касцюмы і ў гурта Litesound (ці яны мо стасаваліся са зместам песні? Я англійскую мову не ведаю; тады хай прабачаць)...

Я гэта да таго, што на адным з «Еўрабачанняў» мы ўжо спрабавалі заваяваць Еўропу майстэрствам пераапранання (а не песняй). Не прайшло ж!

Другое. Першапачатковая пераможца конкурсу Алена Ланская заявіла, што гатова падрыхтаваць на «Еўрабачанне» іншую песню, калі яна знойдзецца. Гэта, на мой погляд, нейкі абсурд. Значыць, сама яна не верыць, што гэтая песня — добрая. А мы, атрымліваецца, павінны паверыць, што тая, новая, будзе лепшая? А калі горшая? Што тады? Трэба ж было шукаць яе да заключнага этапу, на маю думку.

Трэцяе. Я — патрыёт сваёй Радзімы, таму мне за яе і крыўдна. У нас што, няма каму канчаткова падрыхтаваць пераможцу да конкурсу ў Баку? Трэба некага шукаць па-за межамі, спадзявацца, што «вот приедет дядя, дядя нас научит»?!

Асабіста я сімпатызую Кіркораву як артысту. Але ж і мы, як быццам, не лыкам шытыя!

Чацвёртае. Люблю, цаню, паважаю Ціхановіча. Нават вельмі! Але ж уражанне, што на ім клінам сышоўся свет. Ужо колькі гадоў не шанціць нам на дарослым «Еўрабачанні». Дык мо пара паглядзець, што было б, калі б змянілася кіраўніцтва аргкамітэта? Ці я памыляюся?

Пятае. Не разумею, чаму не паказалі мне, усім нам прамога галасавання гледачоў (так робіцца на конкурсах, мы прывыклі). Чаму не прадставілі членаў прафесійнага журы, не сказалі, хто там каму аддаў свой голас? Бо яно ж відавочна: дзе няма празрыстасці, там абавязкова з'яўляюцца падставы для сумневаў — у галоўным: у справядлівасці.

Шостае. Мне цягам усяго конкурсу было крыўдна. Паважаць у Еўропе і ва ўсім свеце нас можна будзе толькі тады, калі мы будзем паважаць сябе самі. Гэты конкурс — яшчэ адно, чарговае, новае пацвярджэнне нашай непавагі да свайго роднага, беларускага. Трэба было з Нарвегіі прыехаць замежніку Сашу Рыбаку, каб беларусы на беларускім «ЕўраФэсце» пачулі беларускае слова! Пра сябе кажу: ішоў канцэрт, выступалі прэтэндэнты на паездку ў Баку — ніякіх асаблівых пачуццяў. А «выскачыў» Саша, зайграў, заспяваў свой «Небасхіл Еўропы» — і адгукнулася не толькі мая душа, але і вочы (змакрэлі чамусьці)...

Выканаўца ў песню павінен укласці душу — сваю і народа, які ты прадстаўляеш. Душа ж тая — у мове! Дык мо пара ўжо нам заспяваць па-беларуску? Тым больш што мова наша па мілагучнасці куды вышэй за іншыя. Яна ў Еўропе другая пасля італьянскай. Дык чаму ж не ўзяць яе ў саюзнікі? Чаму ж не заспяваць па-свойму?

Ірына РУДКОЎСКАЯ,
в. Хатынічы, Ганцавіцкі р-н.

P.S. ***Запісала гэтыя думкі адразу ж пасля прагляду трансляцыі. Не адважылася адправіць. А потым пачула пра скандал і стала так балюча, так крыўдна...***

■

Драматычны лёс Аляксандра Чарвякова

У адзін з дзён 2004 г. на пасяджэнні навуковага савета Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь абмяркоўваўся рукапіс дакументальнага зборніка аб урадзе Беларусі, утвораным 1 студзеня 1919 г. Аўтар гэтых радкоў быў супраць уключэння ў доўгачаканую і вельмі карысную кнігу калькавых, стылістычна не апрацаваных запісаў супрацоўнікамі НКУС допытаў Д.Ф. Жылуновіча і А.Р. Чарвякова ў 30-я гады: нічога новага яны не давалі, а толькі скажалі вобразы людзей. Але матэрыялы ўнеслі, што, на наш погляд, было памылковым.

У гэтыя дні аднаму з першых творцаў беларускай савецкай дзяржаўнасці, старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР з 1920 па 1937 гг., намесніку старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР з 1922 па 1937 гг. Аляксандру Рыгоравічу Чарвякову споўнілася б 120 гадоў.

А.Р. Чарвякоў нарадзіўся 8 сакавіка 1892 года ў вёсцы Дукора на Міншчыне ў сялянскай сям'і. У Беларусі ў той час праходзіў шэраг зямельных, гарадскіх, фінансавых рэформаў. Але бацькі Аляксандра ў пошуках лепшай долі вырашылі адправіцца на новае месца жыхарства — у суседні Віленскі край. Тут будучы беларускі дзеяч скончыў гарадское вучылішча, Віленскі настаўніцкі інстытут.

Дні заробку першага працоўнага хлеба на пасадзе вясковага настаўніка былі цікавымі і павучальнымі. Але не ведаў і не здагадваўся Аляксандр Чарвякоў, што амаль у тыя гады ў розных кутках Беларусі таксама распачалі асветніцкую дзейнасць грамадскія і культурныя дзеячы Дзмітрый Жылуновіч, браты Іван і Антон Луцкевічы, паэты Янка Купала і Якуб Колас, гісторыкі Мітрафан Доўнар-Запольскі, Вацлаў Ластоўскі, Усевалад Ігнатоўскі. Гэта былі людзі, з якімі ён потым часта сустракаўся напярэдадні і ў час лёсавызначальных перамен.

Чарвякову належыць вялікая роля ў пераўтварэнні Беларусі як «заходняга буферу» ў раўнапраўную саюзную савецкую рэспубліку. На жаль, гэты працэс яшчэ мала даследаваны беларускімі вучонымі. Але ў архівах захаваліся лісты А.Р. Чарвякова да старшыні Савета Народных Камісараў РСФСР У.І. Леніна, у якіх ён падвяргае крытыцы расійскія і мясцовыя ваенныя і партыйныя органы ўлады за перашкоды на шляху другога абвяшчэння дзяржаўнай незалежнасці Беларусі (31.07.1920 г.), ігнараванне інтарэсаў беларускага этнасу ў эканамічнай і культурнай палітыцы ў час пераходу Беларусі ад вайны да міру.

Аляксандр Чарвякоў — чалавек нумар адзін у прыняцці Канстытуцыі БССР у 1927 г., першага поўнага зводу заканадаўчых актаў Беларускай ССР, у вяртанні БССР усходніх беларускіх тэрыторый, трапіўшых падчас замежнай ваеннай інтэрвенцыі ў склад РСФСР і УССР. Ён адзіны, каму давяралася прадстаўляць нацыянальныя і знешнепалітычныя інтарэсы Беларусі на пасяджэннях палітбюро ЦК РКП(б) з 1920-х па пачатак 1930-х гг. Аб росце яго аўтарытэту сведчыць, у прыватнасці, узначальванне ім у 1923 -1925 гг. Камісіі ЦВК СССР па ўрэгуляванні межаў паміж РСФСР і УССР, уключэнне ў склад Камісіі па падрыхтоўцы першай Канстытуцыі СССР (1924 г.).

Нельга не адзначыць і такое пытанне, як сувязь А.Р. Чарвякова з прыняццем першай у Беларусі савецкай дзяржаўнай сімволікі. Ён шчыра цікавіўся ўсім, што было звязана з гэтай сферай, і пастаянна дапамагаў спецыялістам. Некаторыя з іх з'яўляліся супрацоўнікамі Інстытута беларускай культуры, Мінскага дзяржаўнага музея, Белдзяржуніверсітэта. 10 снежня 1924 г. адбылося зацвярджэнне праекта эмблемы дзяржаўнага флага БССР з прыняццем яго наступнага апісання: «Флаг чырвоны /або пунсовы/, прамавугольны з адносінамі даўжыні да шырыні, як 2:1. У левым верхнім куце флага, у вянку з жытніх каласоў (левы бок вянка) і дубовай галіны (правы бок вянка) — серп і молат. Праз вянок злева направа наўскасяк з адхіленнем уверх надпіс: Б.С.С.Р на беларускім арнаменце. Наверсе там, дзе сыходзяцца абедзве палавіны вянка, чырвоная пяціканцовая зорка, аблямаваная золатам. Уся эмблема залатая».

Увядзенне новай дзяржаўнай сімволікі Беларусі — флага і герба — была вынікам утварэння ў снежні 1922 г. Саюза ССР, дагавор аб чым ад імя БССР падпісаў А.Р. Чарвякоў. Ён у той час узначальваў ЦВК і СНК Беларускай ССР.

З 1918 і па 1934 гг. у Беларусі дзейнічалі так званыя партыйныя фракцыі. Яны дапамагалі праводзіць ідэі там, дзе, акрамя камуністаў, існавалі беспартыйныя.

Чарвякоў выкарыстоўваў гэтыя асаблівасці для ўмацавання сувязі з простымі людзьмі. Па яго прапанове мясцовыя органы ўлады атрымалі права выдзяляць былым чырвонаармейцам, удзельнікам партызанскага і падпольнага руху ў час нямецкай і польскай інтэрвенцыі дадатковы лесаматэрыял на вырашэнне жыллёвых праблем. Наркамат фінансаў БССР у 1928/1929 навучальным годзе амаль на 50% забяспечыў стыпендыямі студэнтаў БДУ, Віцебскага ветэрынарнага інстытута, Горы-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, тэхнікумаў, на 61% — прафшколы, на 100% — рабфакі, камуністычны ўніверсітэт, савпартшколы, яўрэйскую сельскагаспадарчую школу ў Курасоўшчыне, мінскія курсы грамадазнаўства.

Разам з Чарвяковым у склад фракцый уваходзілі М.М. Галадзед, І.А. Адамовіч, У.М. Ігнатоўскі, З.В. Прышчэпаў, А.В. Баліцкі, З.С. Чарнушэвіч, А.І. Хацкевіч, В.К. Шчарбакоў. На іх пасяджэнні запрашаліся: ад «Звязды» — Нодэль, «Савецкай Беларусі» — Кудзелька, «Рабочего» — Шэпіла, «Беларускай вёскі» — Шукевіч-Траццякоў, Гістпарта — Агурскі, Цэнтраархіва — Жылуновіч.

Імя Чарвякова засталося на старонках дзясяткаў дакументаў аб вылучэнні прадстаўнікоў рабочых і сялянскіх мас Беларусі на працу ў розныя органы дзяржаўнай улады рэспублікі: ад сельскага Савета да ЦВК і СНК БССР. Колькасць такіх вылучэнцаў з 1924 па 1930 гг. толькі па прыблізных падліках склала больш за 5000 чалавек. Нямала было і прадстаўніц жаночага полу. У 1925 г. звыш 100 жанчын былі выбраны на работу ў райвыканкамы, 7 беларускіх сялянак занялі месцы адказных супрацоўнікаў у сістэме ЦВК БССР. Вылучэнцы адыгралі значную ролю ў ажыццяўленні мерапрыемстваў палітыкі індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, здзяйснення сацыялістычнай культурнай рэвалюцыі.

У канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў палепшылася прававое становішча так званых сельскіх батракоў, завяршылася ўтварэнне адукацыйнай сістэмы (пачатковая школа, працоўная сямігодка, тэхнікум, ВНУ). У Мінску адкрыўся Дом асветы. 16 сакавіка 1933 г. партыйная секцыя пры ЦВК БССР аднавіла на рабоце настаўніка Крупскага раёна Сцяпуру, пацярпелага за пісьмовы зварот у сельсавет на рускай мове.

У БССР дзейнічала Беларуская нацыянальная акадэмія навук, каля 30 вышэйшых навучальных устаноў. Упершыню амаль усе дзеці 6-7 гадоў аказаліся ахопленымі пачатковай школай, у вярхах ішлі размовы аб стварэнні сваёй Беларускай нацыянальнай энцыклапедыі. У два разы павялічылася тэрыторыя і ў тры — насельніцтва БССР.

Канкрэтны ўдзел Чарвякова шматгранны. На наш погляд, застаюцца актуальнымі і сёння яго рэкамендацыі па барацьбе супраць фармалізму, страты адказнасці за даручаную справу.

Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў паважаў гісторыю, быў першым, хто ўнёс прапанову аб збіранні ўспамінаў па гісторыі фарміравання грамадскага і рэвалюцыйнага руху на тэрыторыі ўсіх 5 беларускіх губерняў. Мабыць, па гэтай прычыне 27 лістапада 1928 г. члены ЦВК БССР заслухалі даклад Д.Ф. Жылуновіча «Аб дзейнасці Цэнтраархіва і яго ўзаемаадносінах з Гістпартам».

1933 г. На сесіі ЦВК СССР. Злева направа: Казановіч, Сталін, Молатаў, Мусабкоў, Чарвякоў.

У прынятай пастанове паведамляецца: «1. Лічыць неабходным, каб пастаянным адказным супрацоўнікам Цэнтраархіва быў член партыі. 2. Дабіцца, каб загадчыкі акруговых аддзелаў Цэнтраархіва былі таксама членамі партыі. 3. Вылучыць у Цэнтраархіве асобна палітычны аддзел, у якім сканцэнтраваць справы былых жандарскіх і ахоўных упраўленняў, знайсці і месца для матэрыялаў па правядзенні Кастрычніцкай рэвалюцыі. 4. Згодна з пастановай ЦК ВКП (б) у Савет Цэнтраархіва павінны ўвайсці члены калегіі Гістпарта і наадварот — члены Савета Цэнтраархіва — у калегію Гістпарта. 5. Узмацніць працу Цэнтраархіва, стварыўшы Савет Цэнтраархіва, у які ўвесці шэраг адказных партыйных працаўнікоў, а таксама работнікаў па распрацоўцы матэрыялаў па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі. 6. На пленуме Цэнтраархіва паставіць і абмеркаваць пытанне аб распрацоўцы матэрыялаў Цэнтраархіва».

У цэлым перад намі дакумент, скіраваны ў першую чаргу на паляпшэнне супрацоўніцтва двух рэспубліканскіх цэнтраў у вывучэнні гісторыі Беларусі на мяжы XIX—XX стагоддзяў. Прыведзеная тут пастанова ЦК ВКП(б) была прынята 20.08.1928 г. і тычылася цэнтралізацыі архіўнай справы ў межах усяго СССР.

А.Р. Чарвякоў заўсёды імкнуўся рабіць людзям дабро. Узначальваючы Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР, ён у пачатку 20-х гадоў падпісаў пастанову аб прысваенні Д.Ф. Жылуновічу ганаровага звання «Народны пісьменнік Беларусі». У 1928 г. шчыра падтрымаў прапанову аб узнагароджанні В.Ф. Шаранговіча Ордэнам Працоўнага «Чырвонага штандара БССР» «за кіруючую партызанскую працу ў падполлі ў час акупацыі Беларусі белапалякамі».

Вось што піша ў сваіх успамінах дачка Аляксандра Рыгоравіча Соф'я Аляксандраўна: «Успамінаючы бацьку, бачу перад сабою чалавека з добрымі і ўважлівымі вачыма. У маленькім узросце ён прывязваў мяне ручніком да спіны, садзіўся на веласіпед, і мы накіроўваліся на прагулку ў мясцовы лясок. Ён ніколі не хаваў ад нас, дзяцей, кнігі. Калі я пыталася аб той ці іншай кнізе, ён падрабязна і аргументавана тлумачыў, якую кнігу і калі можна чытаць. Вялікай забавай лічыў частаванне нас, дзяцей, чаем са сподкаў... Бацька назаўсёды застаўся ў маім жыцці добрым і справядлівым чалавекам, адданым працы».

Лёс А.Р. Чарвякова аказаўся драматычным. У час работы XVI з'езда КП (б) Б (чэрвень 1937 г.) ён пакончыў жыццё самагубствам, не вытрымаўшы несправядлівых абвінавачванняў.

Сярод мноства афарызмаў ёсць наступны: «Мы славім знакамітых і мала — вялікіх».

У нейкім сэнсе гэта адносіцца і да нашага А.Р. Чарвякова.

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук.

■ Асабістае

МАМА, Я І ЯЕ САЛОДКАЕ ПРОЗВІШЧА

У дзяцінстве я вельмі любіў сваю маму. Любіў за тое, што яна ў мяне такая прыгожая, за тое, што да яе з нейкай асаблівай павагай ставіліся ўсе знаёмыя і незнаёмыя дзядзькі і цёткі, ну і, нарэшце, проста за тое, што гэта ж была мая мама.

Еўдакія Кісель, 1936 г.

Добра памятаю першы пасляваенны год у разбураным вайной Мінску. Мне ў той час было пяць гадоў. Напярэдадні сям'я наша вярнулася з эвакуацыі ў свой цудам ацалелы драўляны дом у Фруктовым завулку каля Юбілейнай плошчы і пасялілася ў адным з трох пакояў, бо астатнія былі занятыя іншымі сем'ямі. Пакой быў маленькі, усяго 8 метраў, але затое ў ім была сапраўдная кафляная печка, у якой па вечарах весела патрэскваў агонь. Чакаючы маму з працы, а вярталася яна заўсёды вельмі позна, я часцяком уладкоўваўся каля цёплай печкі і з цікавасцю слухаў гутаркі старэйшых. Асабліва мне падабалася слухаць іх аповеды пра маму.

Больш за ўсё на гэтую тэму любіла пагаварыць родная маміна сястра — цётка Хрысціна. Пачынала яна звычайна здалёк: пра тое, як даўнымдаўно, калі ў нас яшчэ правіў цар, яны жылі ў старым дзядулевым доме на Рудзеншчыне ў вёсцы з прыгожай беларускай назвай Міхалевічы; як потым была вайна, рэвалюцыя, зноў вайна; як памёр ад ран, атрыманых на той першай (імперыялістычнай) вайне, мой дзед і згарэў падчас вялікага пажару іх дом; і як яны з маёй мамай прыйшлі за пяцьдзясят кіламетраў пешшу ў Мінск паступаць на працу і ўладкаваліся тут на вялікую фабрыку, якая называлася «Кастрычнік». І вось тут пачыналася самая цікавая частка аповеду пра маму.

Цётка Хрысціна ў падрабязнасцях апавядала пра тое, якое цікавае жыццё чакала іх на фабрыцы, як мама вельмі хутка з простай сялянскай дзяўчыны стала лепшай працаўніцай і ўсеагульнай любіміцай у калектыве, якую ўсе звалі няйначай як «наша Адачка», а камсамольцы фабрыкі абралі сваім сакратаром. Я, праўда, не вельмі разумеў тады значэння слова «сакратар», але цётка Хрысціна вымаўляла яго з такім піетэтам і павагай, што я дзіцячай сваёй існасцю адчуваў, што «сакратар» — гэта гучыць выдатна. Тым больш, калі гэта «камсамольскі сакратар».

А ўжо пра жыццё саміх камсамольцаў фабрыкі з аповедаў цёткі Хрысціны можна было б скласці шматтомную кнігу. Рыхтуючыся да вайны з фашыстамі, яны ў вольны ад працы час вучыліся трапна страляць, здавалі нормы на значок «Варашылаўскі стралок», скакалі з парашутам, вучыліся аказваць першую дапамогу параненым і пацярпелым, удзельнічалі ў шматдзённых пешых пераходах у процівагазах і ахоўных супрацьіпрытных касцюмах. І заўсёды напярэдзе ўсіх была мая мама. За гэта яе ўзнагародзілі ордэнам, а калі ў 1936 годзе ў Маскве сабраўся Усесаюзны З'езд Саветаў, на якім павінны былі прыняць новую (Сталінскую) Канстытуцыю краіны, менавіта маме даверылі выступаць ад беларускай дэлегацыі з прывітаннем да З'езда і ўручыць Пісьмо беларускага народа таварышу Сталіну.

Расказваючы пра гэты этап мамінай біяграфіі, цётка Хрысціна пераходзіла на нейкі асабліва ўрачысты тон, які прыводзіў мяне амаль у святое трапятанне. І я ганарыўся маёй мамай, ганарыўся таварышам Сталіным і цёткай Хрысцінай, якая мне пра гэта расказвала.

Аднак у глыбіні маёй дзіцячай душы, як ні дзіўна, сапраўдны гонар тых гадоў за маму быў звязаны зусім не з таварышам Сталіным і нават не з прыгожым маміным ордэнам і яе шматлікімі медалямі, якія зіхацелі пазалотай, а з цудоўным, як мне тады здавалася, прозвішчам мамы. Такога цудоўнага прозвішча не было ні ў аднаго з бацькоў маіх аднагодкаў па дзіцячым садзе. Яе прозвішча — маму называлі Еўдакія або Ада Кісель — у маім досыць няпростым пасляваенным дзяцінстве ўспрымалася як нешта ў вышэйшай ступені прыемнае, смачнае, салодкае і заўсёды асацыявалася з мамай, з яе цёплымі ласкавымі рукамі, пяшчотнай, клапатлівай усмешкай. Я па-сапраўднаму ганарыўся гэтым яе прозвішчам і не пераносіў, калі некаторыя дарослыя, звяртаючыся да мамы, перакручвалі яго, ставячы націск на першым складзе. Са слоў усё той жа цёткі Хрысціны ведаю, што быў нават выпадак, калі маё дзіцячае абурэнне па гэтай прычыне ледзь не сарвала нейкае ўрачыстае мерапрыемства.

Аднойчы мама павінна была выступаць з дакладам на сходзе ў адным з працоўных калектываў горада. Паколькі пакінуць мяне ў той вечар не было з кім, яна была вымушана ўзяць мяне з сабой. У зале маму павялі ў прэзідыум, а мяне даручылі нейкім цёткам у апошнім радзе, папярэдне ўручыўшы пакуначак «падушачак» і загадаўшы быць паслухмяным і паводзіць сябе добра. Я і паводзіў сябе добра, заняты змесцівам свайго пакуначка, пакуль раптам старшыня сходу не абвясціў на ўсю залу: «Слова даецца таварышу Кісель!» — і да трыбуны пайшла мая мама. Пачуўшы гэта, я ўскочыў са свайго месца і абурана закрычаў што ёсць моцы: «Гэта ніякая не Кісель! Гэта мая мама! Яна Кисе́ль, а не Кі́сель!».

У зале на хвілінку ўсталявалася мёртвая цішыня, а затым раздаўся дружны рогат і апладысменты на адрас мамы, якая збянтэжана ўсміхалася на трыбуне. Мяне ж, паколькі я ніяк не хацеў уціхамірыцца, цёткі, што апекавалі, пад гэтыя апладысменты паціху эвакуявалі з залы і адвялі ў буфет. Там мяне пачаставалі вафельнымі трубачкамі з крэмам, сітро і салодкім журавінавым кісялём з булачкай, і мы шчасна дачакаліся заканчэння ўрачыстай часткі сходу. Больш мяне мама на такія мерапрыемствы не брала. Такая вось выйшла цікавая гісторыя са мной, маёй мамай і яе салодкім прозвішчам.

Генадзь ЛАДЫСЕЎ.

8 сакавіка гераіні аповеду Еўдакіі Кісель споўнілася б 100 гадоў.

Не дзівачка, а беларуска

Магіляўчанка Таццяна Красоўская любіць родную мову, модную музыку і свет вакол сябе

ВЯЛІКІ «ПЕРАХОД»

Хоць Таццяна і мае адукацыю настаўніка французскай і англійскай моў, але цяпер яна выкладае мову беларускую. Не школьнікам, а дарослым людзям, якія штотыдзень прыходзяць у гурток Таварыства беларускай мовы.

— Ніхто са сваякоў і майго звычайнага асяроддзя па-беларуску дагэтуль не размаўляе, — прызнаецца Таццяна. — Родную мову я вывучала толькі ў школе. Калі казаць шчыра, тады я не вылучалася энтузіязмам на беларускіх уроках, але аднойчы стала проста соромна. За сваю родную мову і за сябе, бо я яе не ведаю.

Больш за год дзяўчыне спатрэбілася на вялікі «моўны пераход», і не ўсё было гладка. Муж Віталь, які працуе ў прыватнай фірме, што гандлюе будаўнічымі матэрыяламі, і далёкі ад лінгвістыкі, спачатку не вельмі добра ўспрыняў вестку аб вяртанні маладой жонкі да традыцый. Татальны пераход на родную мову падаўся маладому чалавеку надта радыкальным: беларускамоўных людзей ён, як і многія нашы суайчыннікі, лічыць усё ж дзівакамі. Але потым Віталь стаў паважаць выбар Таццяны, бо зразумеў, што для беларусізацыі патрабуюцца не толькі веды, але і смеласць.

— Аднойчы, у самым пачатку, мяне пакрыўдзілі, я нават плакала. Але потым усё роўна вырашыла не саступаць, не зважаць на іншых: не падабаецца мая мова — не трэба са мной кантактаваць. А я сама заўсёды буду размаўляць па-беларуску! — расказвае дзяўчына.

Праз знаёмага Таццяна даведалася пра Таварыства беларускай мовы, звязалася з яго ўдзельнікамі праз сайт і пераканалася, што яе аднадумцы — людзі не толькі старэйшага і сярэдняга ўзросту, але і моладзь, якая імкнецца размаўляць па-беларуску і лічыць гэта сучасным.

Пасля таго, як крымскі курортны раман Таццяны і Віталя перарос у сапраўднае каханне, а затым і прапанову рукі і сэрца, дзяўчына вырашыла ажыццявіць сваю даўнюю мару — зрабіць беларускае вясселле.

— Я не хацела, каб было як «ва ўсіх», — узгадвае яна. — Пайшла

Беларусачка.

на курсы вышывання, сама вышыла блакітнымі валошкамі кашулю і спадніцу. Замовіла майстрам ручнікі — цяпер у мяне іх цэлая калекцыя! У мяне быў вянок на галаве, і я не кідала дзяўчатам букет. Мы знайшлі кампраміс паміж сучаснымі вясельнымі абрадамі і старадаўнімі народнымі. Да нас нават з Сургута прыехалі сваякі, каб паглядзець, што такое беларускае вяселле! І гэта было цікава і прыгожа!

ПРЫГАЖУНЯ, РАЗУМНІЦА, ВЕГЕТАРЫЯНКА

«Свет навокал мяне,» — так гаворыць Таццяна пра самую важную справу ў сваім жыцці. Любімы занятак для душы — доўгія пешыя шпацыры, пажадана пад дажджом. І, зразумела, з плэерам: жыццё 26-гадовай магілёўскай прыгажуні павінен суправаджаць любімы саўндтрэк. Зусім як у кіно. Але яе знешні выгляд, кіношны альбо не, не вельмі турбуе Таццяну. Спадзявацца толькі на знешнасць яна не жадае.

— Безумоўна, я маладая жанчына, і хачу быць прыгожай для сябе і для каханага мужчыны, — расказвае яна. — Я неабыякавая да моды, але больш цаню змест, чым форму. Трэба жыць не толькі «мэйкапам», але духоўнасцю. Хаця, з іншага боку, адноўчы я прачытала «УКантакце» шчырае пажаданне клапаціцца пра фігуру, бо з першага погляду наўрад ці хто ацэніць ваш унутраны свет. Тут таксама ёсць рацыя.

Здаровы лад жыцця для Таццяны — гэта гімнастычныя практыкаванні і вегетарыянства. Прычым апошняе азначае не клопат пра фігуру, а перакананне. «Не хачу, каб дзеля мяне забівалі», — заявіла яна яшчэ ў 17 гадоў, і з тых часоў нават рыбу не есць. Малако і яйкі — самая «цяжкая» ежа ў рацыёне маладой жанчыны. Пакуль маладыя людзі робяць рамонт у сваёй кватэры, яны жывуць з бацькамі Таццяны. Прычым бацькі перажываюць, што Таццяна недакормлівае свайго хударлявага мужа.

— З мужам у нас у гэтым плане суладдзе: ён любіць мяса, а я — грыбы, — усміхаецца яна.

Інтэрнэт — гэта ўжо неабходная частка жыцця маладой жанчыны. Таццяна аддае перавагу сацыяльным сеткам і сусветным навінам. Шукае музыку і відэа, якія сталі вядомымі і папулярнымі. Таксама любіць беларускую музыку і кнігі. У вясельнае падарожжа ў Іспанію яна брала з сабой «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча, а апошнім часам вывучае спадчыну лінгвіста Яна Станкевіча для заняткаў у беларускім гуртку.

Яна лічыць, што жанчына абавязкова павінна працаваць.

— Не хацелася б толькі, каб усё жыццё складалася з зарабляння грошай, — дзеліцца Таццяна. — Калі б у мяне былі вялікія грошы, я зрабіла б у былым старым будынку магілёўскай гімназіі, дзе цяпер гандлёвы цэнтр, музей душы, каб кожны мог не для камерцыі паказаць людзям сваю творчасць. І яшчэ б пасадзіла бярозавы гай!

ВЯСНА І КАХАННЕ

Сёння многія прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва маюць смеласць сказаць, што яны моцныя і могуць паклапаціцца самі пра сябе. «Я сама» — гэта не лепшы лозунг, паводле меркавання Таццяны. Яна не ўяўляе сабе жыццё без мужчын і кахання.

— А навошта тады жыць? Без кахання ўсё шэрае і пустое. Калі ў тваё жыццё ўваходзяць пачуцці, то нават веснавое неба становіцца больш блакітным.

...Пра жанчын жартуюць, што спачатку яны натхняюць мужчын на вялікія справы, а потым перашкаджаюць іх рабіць. Таццяна лічыць гэта няпраўдай. І прыводзіць у якасці прыкладу... папірус, які калісьці пабачыла ў Егіпце: мужчына страляе з лука, а жанчына паказвае яму, куды цэліцца. Так, прынамсі, адбываецца і ў жыцці...

Я ўжо вырашыла: калі ў нас з'явіцца дзіця, буду размаўляць з ім на роднай мове. Каб для яго беларуская мова сапраўды была матчынай.

Але гэта ўсё ў будучыні, а пакуль магіляўчанка радуецца вясне, рыхтуецца да свята і жадае ўсім жанчынам 8 Сакавіка сапраўднай жаноцкасці.

Ілона ІВАНОВА.
Фота аўтара і з сямейнага архіва гераіні.

Незабыўнае вяселле.

■ Ён і Яна

На адлегласці выцягнутай рукі

Так сталася, што наш стаж працы ў «Звяздзе» адрозніваецца ад сямейнага толькі на пяць месяцаў: мы пабраліся шлюбам неўзабаве пасля пераходу ў старэйшую штодзённую беларускамоўную газету. А дагэтуль недзе два гады мы разам жа працавалі ў інфармацыйным агенцтве, куды я ўласна і запрасіў будучую жонку. Выходзіць, што нашы працоўныя сталы стаяць побач вось ужо дзевятнаццаты год запар. Больш за тое, увесь гэты час мы сядзім на адлегласці выцягнутай рукі. За адсутнасцю іншага вопыту мне цяжка ўявіць, як яно можа быць інакш...

Для нас гэта настолькі натуральная сітуацыя, што мы разумеем, што ў жыцці бывае і па-іншаму толькі са слоў калег або ў рэдкія моманты, калі па нейкай прычыне ідзём на працу або сыходзім з яе паасобку. Ці па іх традыцыйных жартах: «А чаму ты адзін-адна? А дзе Сяргей ці Надзея?» Балазе, хоць пытацца ўжо стаміліся: «А як вам разам увесь час — і на працы, і дома?» А нам — добра! Натуральна, так стала не адразу: была і прыцірка характараў, і падсвядомая барацьба за лідарства. Адзінае як падаецца, ніколі не было ў нас прафесійнай рэўнасці. Поспехам і ўзнагародам сваёй жонкі я заўсёды радуюся, паколькі бачу на свае вочы, як яны ёй даюцца.

У нас аднолькавыя погляды на жыццё, стаўленне да працы і адпачынку, мы любім адзін і той жа гумар, любімыя фільмы можам цытаваць па чарзе: адзін пачынае цытату, другі заканчвае. І ў гэтым, вядома, галоўны сакрэт. Пра дробныя канфлікты, пярэчанні адно аднаму, нейкія крыўды на роўным месцы я не гавару — у каго іх няма? Як і іншыя людзі, мы можам паспрачацца і па працы, і па бытавых момантах. Толькі нам дзеля гэтага не трэба чакаць вечара, каб «сысціся» ў слоўнай баталіі!

Калі больш сур'ёзна, то мне цяжка аб'ектыўна гаварыць пра тое, ці кідаецца ў вочы на працы, што мы — сужэнцы. Можа, у якія моманты прысутнасць гэта і замінае нечым, але мы заўсёды імкнуліся не дэманстраваць навакольным не тое што сваіх пачуццяў, а ўвогуле, што мы — муж і жонка. Хоць, калі некага з нас крыўдуюць, гэта, бясспрэчна, праяўляецца на іншым... Але для зусім старонніх людзей мы — калегі. Калі чытачы звяртаюцца з якой праблемай ці пытаннем, якімі займаецца жонка, я так і адказваю: перадаю слухаўку калезе, маўляў, гэта яе «епархія».

На працы мы — у адным «экіпажы танка»: па чарзе страляем, па чарзе падносім снарады. Іншымі словамі, заўсёды падстрахуем адно аднаго: напрыклад, падчас дзяжурства па нумары, падкажам адно аднаму тэму матэрыялу. Тут, безумоўна, ёсць як «плюс», так і «мінус»: бывае, і сваёй працы «вышэй за дах», а даводзіцца браць на сябе адначасова яшчэ і «кавалак» ад сваёй палавінкі. Але ж дапамагаеш не чужому, а роднаму чалавеку! Хоць увогуле ў нас у кожнага — свой кірунак і свае абавязкі.

Якія адназначныя мінусы сумеснага знаходжання сужэнцаў на працы? Вось я, напрыклад, палюбоўніцу не магу завесці, бо ўвесь час навідавоку ў жонкі! Жартую, вядома.

Са станоўчага: у нашай сям'і ніводнага разу не было сваркі з-за таго, што, умоўна кажучы, не прыгатаваны боршч, бо мы ўвесь час на вачах адно ў аднаго. Калі разам вяртаемся позна дадому, разам жа становімся да пліты гатаваць вячэру. Ужо неаднойчы сыходзіліся на тым, што калі б не працавалі разам, то наўрад ці б разумелі, як столькі часу можна аддаваць працы, чаму часам бывае такое эмацыянальнае і фізічнае знясіленне, што не хочацца нават размаўляць.... Не трэба расказваць пра стасункі з калегамі, тлумачыць кожны раз, хто такая Людміла Іванаўна і якое заданне ты атрымаў ад яе ў чарговы раз, чаму на Пашу ў кабінет заглянула паглядзець палова жанчын з рэдакцыі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

P.S. ***Правілі матэрыял адно аднаго. Крыху паспрачаліся..***

Сумесная праца сужэнцаў: плюсы і мінусы

Нават выхадны — не без «творчых момантаў»

Як у любога медаля ёсць два бакі, так і ў нашым становішчы ёсць пэўныя мінусы. Пра «плюсы», па большасці, сказаў мой муж, а мне даручана было агучыць «мінусы». Галоўная праблема заключаецца ў тым, што размовы адносна працы ў нас практычна ніколі не спыняюцца. Асабістую «планёрку» ў нашай сям'і, у адрозненне ад рэдакцыйнай, мы праводзім не раніцай, а ўвечары, калі ідзём пехатой дадому ад метро — абмяркоўваем прайшоўшы дзень і ўдакладняем нашы планы на бліжэйшую будучыню. Нават выхадны дзень рэдка абыходзіцца ў нас без «творчых момантаў».

Мы ўвесь час спрабуем з гэтым змагацца. Нават дадзенае адно аднаму абяцанне, што сёння на абмеркаванні работы мы ставім «кропку», не выратоўвае. Размежаваць работу і асабістае жыццё ў нашым выпадку надзвычай праблематычна. У чым мы сышліся адназначна — інтэрнэту ў нашым доме не месца... Дастаткова таго, што нярэдка мы «работу» з работы нясём дадому, і ў гэтым выпадку нам даводзіцца «размяркоўвацца», хто за пісьмовым сталом будзе працаваць, а каму сёння месца на кухні.

А яшчэ ў нас у кватэры вельмі шмат газет, блакнотаў і розных, як мой муж сцвярджае, важных папер. Абяцанні кшталту, «пачакай, родненькая, як толькі будзе вольны час, я навяду парадак са сваім архівам», я чую шмат гадоў запар. Але вольны час, зразумела, не з'яўляецца, таму «завалы» працягваюць расці, а шанцы разабрацца ў іх катастрафічна змяншаюцца. На маю просьбу раз і назаўсёды з гэтым разабрацца, чую ў адказ: «Даражэнькая, я ж не магу выкінуць усё адным махам, а раптам у сметніцу адправіцца штосьці важнае і патрэбнае для нашай работы...» Я ведаю, што ў мужчын-аўтааматараў ёсць свая свяшчэнная тэрыторыя — гэта іх гараж. У майго мужа таксама ёсць свая тэрыторыя, на якую нават мне ўваход забаронены...

Яшчэ адзін мінус у сумеснай рабоце — заробак абодва атрымліваюць і нясуць дадому ў адзін дзень, таму да планавання сямейных выдаткаў даводзіцца падыходзіць вельмі адказна. Калі раптам здарацца затрымкі з выплатамі, ні з чым застануцца адначасова абодва. Існуе і такая нязручнасць, як праблема зрабіць адно аднаму сюрпрыз. Усе нашы фінансы навідавоку, таму без вынаходлівасці вельмі складана здзівіць адно аднаго нечаканымі падарункамі. Аднак час ад часу нам гэта ўсё ж такі ўдаецца...

Але адзін з самых непрыемных момантаў ад сумеснай працы — хваляванні за іншага. Калі начальства — з нагоды або без яе — хоча «накруціць хвост» любому з нас. А яшчэ бывае і так, што ў канкрэтны момант некага з нас няма ў рэдакцыі, а кіраўніцтву карціць «уставіць пістон». Хто патрапіў пад руку, той і трымае ўдар, «адграбае» за іншага. Логіка жалезная — вы ж разам! Сапраўды, якая розніца? Крыўдзяць аднаго — крыўдзяць аўтаматычна і яго палавінку. З іншага боку, не кожны адважыцца мяне пакрыўдзіць, бо за мной ёсць мужава плячо.

Не вельмі прыемна пра гэта казаць, аднак прысутнічае і яшчэ адзін малапрыемны нюанс: і часу, і падстаў для таго, каб паспрачацца ці пасварыцца, у нас значна больш, чым у сямейных людзей, якія сустракаюцца на пару гадзін увечары. І калі мы ўсё ж такі сварымся, то сапсаваны настрой прыносім з дому на работу, а з работы — дадому. Затое, калі ў кагосьці з нас дваіх з'яўляецца падстава для радасці, то і другі не застаецца ўбаку — мы неадкладна дзелімся сваёй радасцю, сваімі дасягненнямі і перамогамі, бо працуем на адлегласці выцягнутай рукі. І ўсё ж такі як гэта цудоўна — працаваць са сваім мужам у адным экіпажы!

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Не толькі для жанчын

НАТХНЁНА, ЗДОРАВА І... СМАЧНА!

Супрацоўнікі Брэсцкай абласной газеты «Народная трыбуна» з дапамогай чытачоў і герояў публікацый выдалі кнігу арыгінальных кулінарных рэцэптаў

Штотыднёвік «Народная трыбуна» (ці не адзіная з абласных газет рэспублікі, што выходзіць цалкам на беларускай мове) даўно вядзе дыялог з чытачамі, у тым ліку сваёй адмысловай рубрыкай «Смаката» ад «НТ». Рубрыка і з'явілася на пачатку 2008 года па прапанове чытачоў. З таго часу кожную суботу на апошняй старонцы газеты друкуецца эксклюзіўны рэцэпт нейкай стравы. Эксклюзіўны, таму што прадстаўляе яго гаспадыня, якая не раз апрабавала страву на сваёй кухні.

Традыцыйна рэцэпт даюць з фотаздымкам яго аўтара. Гаспадынямі нярэдка выступаюць дэпутаты Вярхоўнага Савета краіны, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый, жанчыны актыўныя, дзелавыя, добра вядомыя на Брэстчыне або ў адным з яе рэгіёнаў. Смакату прапаноўвалі таксама настаўнікі, урачы, работнікі культуры, фінансісты, рэдактары раённых газет, шаноўныя ветэраны і зусім маладыя, без пэўнага досведу гаспадыні. Трапляліся ў гэтай рубрыцы і мужчыны. Адны з іх ганарліва заўважалі: маўляў, як бы кабеты ні хвалілі ся, усё роўна менавіта мужчыны — лепшыя на свеце кухары, і прапаноўвалі свой спосаб прыгатавання мяса. Іншыя ж сумленна прызнаваліся, што рэцэптам даўно і трывала карыстаецца жонка, а яны толькі агучваюць сямейную кухонную традыцыю.

У кнігу, якая ўбачыла свет напярэдадні 8 Сакавіка, увайшло крыху больш за дзве сотні самых цікавых і апетытных публікацый. Кожная старонка ўключае ў сябе партрэт гаспадыні або гаспадара і падрабязны парадак прыгатавання стравы. Ёсць халодныя закускі, супы і баршчы, гарачыя стравы, выпечка і дэсерты, а таксама агароднінныя нарыхтоўкі. Некаторыя аўтары вельмі цікава падаюць свой рэцэпт. Напрыклад, дырэктар абласной бібліятэкі Тамара Данілюк прысвяціла ледзь не оду сваёй любімай прасяной кашы. Аказваецца, аматарам гэтай здаровай ежы быў і Булат Акуджава. У сваім «Спатканні з Банапартам» ён вельмі дасціпна апісаў маленькія сонечныя зярняткі. Пасля такой падрабязнай цытаты са знакамітага барда, якую прывяла Тамара, вядома ж, захочацца прыгатаваць і паспытаць кашу «Сонечную».

А дырэктар Брэсцкага філіяла «Белпошта» Валянціна Пух, як гаспадыня з досведам, дзеліцца з маладзенькімі гаспадынямі навукай яшчэ сваёй мамы, якая наказвала дачцэ, што муж павінен быць заўсёды добра накормлены. І паколькі Валянціна Мікалаеўна і яе муж родам з Украіны, яе рэцэпты ўяўляюць сабой спалучэнне беларуска-ўкраінскай кухні.

Аўтару гэтых радкоў было вельмі прыемна сустрэць на старонках кнігі герояў публікацый, прыхільнікаў і пастаянных чытачоў «Звязды». Маёр міліцыі Наталля Сахарчук не раз выступала і героем інтэрв'ю, і аўтарам заметак нашага сумеснага з Дзяржаўтаінспекцыяй праекта «Радар». У «Смакаце» яна прэзентуе арыгінальную халодную закуску. «Франтавы шафёр Вольга» — называўся матэрыял у «Звяздзе» за 8 мая 2009 года. Мы пісалі пра Вольгу Аксенцьеўну Андрасюк, маленькую кволую жанчыну, якая чатыры ваенныя гады вадзіла велікагрузны «Шэўрале» з боепрыпасамі. Ветэрана, на жаль, ужо няма з намі. А вось яе рэцэпт нарыхтоўкі агароднінны на зіму застаўся на добры ўспамін усім, хто возьме ў рукі кнігу. Чытач сустракаў таксама на старонках нашага выдання імёны старшыні Азяцкага сельскага Савета Жабінкаўскага раёна Ганны Шкарупы, старшыні Пінскага гарадскога Савета Ніны Кахновіч, Бярозаўскага раённага — Тамары Карпенкі, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ларысы Багдановіч. У кнізе ўсе яны, як вы здагадаліся, прадстаўляюць любімыя стравы сваіх сем'яў.

«Можна жыць проста, аскетычна, без яркіх уражанняў, а можна інакш: натхнёна, здорава і... смачна! — гаворыць галоўны рэдактар «Народнай трыбуны» Галіна МАЗІНА. — Нашы чытачы і аўтары нашай рубрыкі аддалі перавагу апошняму. Згадзіцеся, у жыцці ўсё павінна быць гарманічна ўзаемазвязана

Галіна МАЗІНА.

— твар і душа, быт і адзенне, ежа духоўная і фізічная. Толькі ў гэтым выпадку кожнае пражытае імгненне будзе прыносіць радасць. А ў стане душэўнага ўздыму чалавек можа шчыра аддзячыць жыццю, быць карысным і сваёй сям'і, і сваёй краіне.

Што б мы ні казалі, ды — не будзем хітрыць! — усё-такі менавіта ежа з'яўляецца той прыемнай неабходнасцю, якая не толькі дае нам сілы для жыцця, але і аздабляе яго — праўда, калі да кулінарыі падыходзіць творча, — лічыць Галіна Міхайлаўна. І спадзяецца з дапамогай новай кнігі падштурхнуць многіх да творчасці на кухні і трохі ўпрыгожым паўсядзённае жыццё».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

А ЦЯПЕР НЕКАЛЬКІ РЭЦЭПТАЎ АД «СМАКАТЫ».

Прасяная каша «Сонечная» ад Тамары ДАНІЛЮК, дырэктара абласной бібліятэкі імя М. Горкага:

Трэба 100 грамаў сметанковага масла растапіць у сатэйніку і абсмажыць на ім гарбуз, нарэзаны дробнымі кубікамі (2 шклянкі кубікаў). Затым уліць туды 2 шклянкі малака, давесці да кіпення і паварыць 2-7 мінут. Усыпаць адну шклянку проса, дабавіць крыху солі і сталовую лыжку мёду. Варыць хвілін 15. Потым паставіць у духоўку на 25-30 хвілін. Каша атрымліваецца духмянай і сонечнай. Будзьце здаровыя і радасныя!

Зялёнкі «Маларыцкія» ад Таццяны ЛАЎРЫНЕНКІ, начальніка аддзела адукацыі Маларыцкага райвыканкама:

Нам спатрэбяцца: *3 кг адварных грыбоў, 0,5 літра таматнага соусу, 0,5 літра алею, 1 кг цыбулі, соль, воцат.*

Цыбулю абсмажваем на алеі да залацістага колеру. Перамешваем яе з адварнымі грыбамі, таматным соусам, алеем, солім і тушым, пастаянна памешваючы, на маленькім агні каля гадзіны. За 10 хвілін да гатоўнасці дадаём 1-2 сталовыя лыжкі воцату. Калі алей стане празрыстым, гатовыя грыбы выкладваем у стэрылізаваныя слоікі і закатваем. Такія зялёнкі прыйдуцца да любога стала. Смачна есці!

Закуска «Халодны Напалеон» ад Наталлі САХАРЧУК, начальніка аддзела па агітацыі і прапагандзе абласной ДАІ:

Нам спатрэбяцца: *каржы слоенага цеста (можна пакупныя) 6 штук, 300 г грыбоў (варанья ці кансерваваныя), 3 сярэдняга памеру цыбуліны, 4 яйкі, 300 г цвёрдага сыру, маянэз (лепш узяць аліўкавы).*

Наразаем грыбы, надзіраем на тарцы сыр і адварваем укрутую яйкі. Пасіруем цыбулю да залацістага колеру і дадаём да грыбоў. Інгрэдыенты (сыр, грыбы, яйкі) асобна раскладваем па трох ёмістасцях. Я выкарыстоўваю піялы. Запраўляем іх маянэзам і перамешваем да аднароднай масы, толькі не робім надта рэдкай. Затым змяшчаем на блюда першы корж і на яго — грыбы. Зверху накрываем новым каржом і выкладваем яйкі. Далей паўтараем гэтыя маніпуляцыі ў такой чарзе: сыр, грыбы, яйкі, сыр. Зверху можна ўпрыгожыць зяленівам або арэхамі. На 1-2 гадзіны ставім торт у халадзільнік. Пасля падаём на стол. Абяцаю, што такая закуска будзе даспадобы ўсім, бо і выгляд мае незвычайны, і смак — вельмі незабыўны.

Шчаўе «Грузінскі акцэнт» ад Галіны МАЗІНАЙ, галоўнага рэдактара «НТ», які яна падгледзела ў Грузіі:

Патрэбна: *шчаўе, 2 ст. лыжкі рысу, зяленіва — кроп, пятрушка (можна базілік і кінзу), 1 морквіна, 2-3 бульбіны, 1 цыбуліна, часнок, таматны соус, смятана ці кефір, грудзінка або сала, соль, перац.*

У каструлю з кіпнем кладзём рыс, затым — парэзаную бульбу. Калі яны зварацца, кідаем шчаўе, а праз некалькі хвілін — падрыхтаваную запраўку (спачатку на патэльні абсмажылі здробненае сала ці грудзінку, да якога дадалі парэзаныя цыбулю і моркву, напрыканцы — таматны соус). Выключыўшы агонь, засыпаем у каструлю шмат зяленіва. Нарэшце, апошні штрых — калі будзеце разліваць шчаўе па талерках, запраўце яго смятанай альбо кефірам са здробненым часнаком.

Сардэчна віншуем цудоўную жанчыну, любячую матулю, клапатлівую бабулю **Зінаіду Цімафееўну ФІЯЛКОЎСКУЮ** з г.п. Бялынічы з юбілейным днём нараджэння — **65-годдзем.**

З любоўю Валянціна, Марыя, іх сем'і і ўсе родныя з Мінска, Слуцка і Чэрвеня.

Ад шчырага сэрца ў дзень юбілею
Жадаем мы радасці, светлай надзеі,
Спакою і шчасця ў будні і ў святы,
Хай добрыя весткі прыходзяць у хату.
Яшчэ мы жадаем здароўя і сілы,
Жыццё няхай будзе доўгім, шчаслівым.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

Совместного открытого акционерного общества «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум – наша косметика»,

28 марта 2012 года в 17.00 в административно-хозяйственном здании СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум – наша косметика», расположенном по адресу: город Минск, улица Володько, 6, состоится очередное общее собрание акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об отчете Наблюдательного совета Общества.
2. Об отчете директора и главного бухгалтера Общества о результатах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и утверждении основных направлений деятельности на 2012 год.
3. Об отчете Ревизионной комиссии Общества о результатах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. О рассмотрении аудиторского заключения, об утверждении годового баланса, отчета о прибылях и убытках.
5. Об утверждении порядка распределения прибыли Общества за 2011 год, об утверждении нормативов распределения прибыли в 2012 году.
6. О выборах членов Наблюдательного совета Общества на 2012–2013 год.
7. О выборах членов Ревизионной комиссии Общества на 2012–2013 год.
8. О внесении изменений и дополнений в Порядок учета аффилированных лиц Общества и утверждении новой редакции Порядка учета аффилированных лиц СОАО «Парфюмерно - косметическая фабрика «Модум – наша косметика».

Начало регистрации акционеров в 16.30.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 23 марта 2012 года.

При себе иметь документы, удостоверяющие личность и полномочия.

УНП 100092830

Наблюдательный совет СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум – наша косметика»

Минский городской центр недвижимости

ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении 28 марта 2012 г. открытого конкурса на право размещения средств наружной рекламы вдоль ул. Лейтенанта Кижеватова в г. Минске, опубликованное в газете «Звязда» от 23 февраля 2012 г., вносится следующее изменение:

в заголовке столбца 2 таблицы ИСКЛЮЧАЮТСЯ СЛОВА «правая сторона».

УНП 190398583.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «СТОЛИЧНЫЙ ПРОСПЕКТ»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,

которое состоится 30 марта 2012 года в здании клуба ОАО «Жабинковский сахарный завод» (Брестская обл., г. Жабинка). Начало проведения собрания в 12.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях деятельности Общества в 2012 году.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе.
3. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и отчет ревизионной комиссии.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения чистой прибыли за 2011 год. О выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение плана распределения чистой прибыли на 2012 год и 1 квартал 2013 года.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О назначении вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в устав Общества.

Материалы собрания доступны для ознакомления с 19.03.2012 до 29.03.2012 с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Титова, 3.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 01.03.2012 г. Регистрация участников — с 11.30 до 12.00 по месту проведения собрания на основании документов, удостоверяющих личность физических лиц, а также документов, подтверждающих полномочия должностных лиц предприятий и организаций.

УНП 290984478

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Аукцион состоится 12 апреля 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

